Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 ЖНІЎНЯ 2013 г. СЕРАДА № 150 (27515) Кошт 1600 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Якая яна, дэпутат Палаты прадстаўнікоў? Якім чынам жанчыны трапляюць на такую складаную працу і як з ёй спраўляюцца?

СТАР. 4

ЦЫТАТА ДНЯ

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Індыі ў Рэспубліцы Беларусь Манодж Кумар Бхарці:

«На мой погляд, прыйшоў час для сумесных праектаў у сферы навукі і ІТ-тэхналогій. Мы адзначаем, што беларускія ІТ-спецыялісты павялічылі сваю дзелавую актыўнасць у кантактах з індыйскімі партнёрамі. Мы выдаём усё больш дзелавых віз прадстаўнікам беларускай ІТ-індустрыі і спадзяёмся, што гэтая актыўнасць выкліча свайго роду эфект снежнага кома, паколькі ІТ-сектар у Беларусі значна вырас за апошнія два гады і прыйшоў час працаваць разам для максімізацыі прыбытку».

КАРАТКА

Найбуйнейшая спецыялізаваная выстаўка-кірмаш «Мэбля-2014» пройдзе ў Мінску з 18 па 21 верасня гэтага года.

Скаргі беларусаў, якія паступалі ў кантакт-цэнтр Нацбанка у першым паўгоддзі 2013 года, найбольш часта датычыліся сферы крэдытавання.

Наглядныя органы Дзяржстандарта праводзяць праверкі і маніторынг паказчыкаў якасці і бяспекі кандытарскай прадукцыі Roshen.

На існуючых у Мінску 11,5 тыс. урачэбных пасад працуюць 9 тыс. 168 урачоў, з іх амаль 1,6 тыс. — пенсіянеры. Работнікаў з сярэдняй медыцынскай адукацыяй налічваецца 22,5 тыс. (укамплектаванасць кадрамі складае 75,4 працэнта). Сярэднямесячная заработная плата сталічных медыцынскіх работнікаў складае Br4 млн 870 тыс.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.08.2013 г.

Долар ЗША	8890,00	▼
Еўра	11820,00	▼
Рас. руб.	269,00	▼
Укр. грыўня	1095,47	▼

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 24°
Віцебск	+ 21°
Гомель	+ 24°
Гродна	+ 23°
Магілёў	+ 22°
Мінск	+ 21°

ISSN 1990 - 763X

ВЯСКОВЫЯ КАНІКУЛЫ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Напярэдзе ў школьнікаў яшчэ два тыдні канікулаў. А вёска для баўлення вольнага часу — самае цудоўнае месца, лічаць сяброўкі Ліза Антонава і Даша Шчарбенка. Ліза — мясцовая, з вёскі Гарадок, Даша прыехала на лета да бабулі. Дзяўчаты часта назіраюць, як спраўляецца з нялёгкай сялянскай працай суседскі конь Каштан. А ў хвіліны адпачынку прыносяць яму ласункі.

в. Гарадок, Мінская вобл.

НЕ СТРЫМЛІВАЦЬ ІНІЦЫЯТЫВУ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць важным прыняць у дзяржаве меры, накіраваныя на разняволенне дзелавой ініцыятывы ва ўмовах аб'ектыўна існуючай прадпрымальніцкай рызыкі. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў 13 жніўня на нарадзе, дзе разглядаліся пытанні далейшага ўдасканалення крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага заканадаўства, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

У гэтых мэтах быў падрыхтаваны праект закона «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Крымінальны, Крымінальна-працэсуальны, Крымінальна-выканаўчы кодэксы Рэспублікі Беларусь, Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях».

Гэта самы значны за апошнія гады законапраект, накіраваны на лібералізацыю і гуманізацыю крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага заканадаўства. Дакумент рыхтаваўся па даручэнні Прэзідэнта.

Праект закона змяшчае сур'ёзныя навацыі, у прыватнасці, прадугледжвае выключэнне проціпраўнасці дзеяння пры дзелавой рызыцы, прымяненне дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве, укараненне крымінальна-прававой кампенсацыі, дэкрыміналізацыю асобных дзеянняў, якія не ўяўляюць сабой вялікай грамадскай небяспекі, а таксама іншыя істотныя пераўтварэнні ў разглядаемай сферы. У бок змякчэння прапануецца скарэктаваць шэраг артыкулаў КК, аптымізаваць тэрміны пакарання, увесці альтэрнатыўныя віды адказнасці.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што неабходна ўлічваць усе магчымыя вынікі прапануемых мер і дакладна ўяўляць механізм іх практычнай рэалізацыі.

«У нас павінна быць цвёрдая ўпэўненасць у тым, што прадугледжаная праектам аптымізацыя крымінальна-прававых інструментаў не прывядзе да беспакаранасці асоб, якія ўчынілі дзеянні, безумоўна небяспечныя для дзяржавы, грамадства або нашых грамадзян», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што органам крымінальнага праследавання неабходна мець набор сродкаў для барацьбы з карупцыяй і іншымі злачынствамі, які забяспечвае няўхільнасць пакарання.

«З другога боку, выпрацаваныя меры павінны сапраўды разняволіць дзелавую ініцыятыву ва ўмовах аб'ектыўна існуючай прадпрымальніцкай рызыкі. Крымінальны закон не павінен быць пудзілам для суб'ектаў гаспадарання, якія дзейнічаюць строга ў рамках прававога поля і ніяк не звязаны з крыміналам». «Інтарэсы дзяржавы і нашага чалавека павінны ляжаць у аснове любых пераўтварэнняў, рэформ, навацый і гэтак далей», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Па выніках нарады прынята рашэнне, што прапанаваны законапраект будзе прадстаўлены на абмеркаванне дэпутатам сумесна з юрыдычнымі коламі.

Славісты свету збяруцца ў Мінску

20 — 27 жніўня ў Мінску пройдзе XV Міжнародны з'езд славістаў. Ён праводзіцца раз у пяць гадоў у розных славянскіх краінах, і сёлета менавіта наша сталіца прымае гасцей. Традыцыйна, да мовы, культуры, фальклору краіны, у якой праводзіцца з'езд, звернута асаблівая ўвага ў дакладах замежных навукоўцаў. Таксама яны маюць магчымасць непасрэднага знаёмства з народам і яго культурай.

Рашэнне аб правядзенні XV Міжнароднага з'езда славістаў у Мінску прынята ў 2008 годзе ў Охрыдзе (Рэспубліка Македонія) падчас правядзення папярэдняга форуму. Дарэчы, тэматыка выпрацоўваецца перад з'ездам за некалькі гадоў. Сёлета будзе ўзнята шмат тэм, прысвечаных гісторыі і культуры Беларусі, пачынаючы ад мовы першага Статута ВКЛ і Бібліі Скарыны і заканчваючы праблемамі беларускай трасянкі.

Рабочыя мовы з'езда — гэта ўсе славянскія мовы. Таму кожны навуковец, выступаючы на сваёй мове, усе іншыя мовы таксама павінен разумець. Многія нашы выступоўцы будуць карыстацца менавіта беларускай, што паспрыяе яе больш шырокаму распаўсюджванню ў міжнародным навуковым асяродку.

СТАР. 2

■ Падрабязнасці

ПРАЦОЎНЫ СЕМЕСТР — КРУГЛЫ ГОД

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісаў 12 жніўня Указ № 356, якім унесены змяненні і дапаўненні ва Указ ад 16 красавіка 2012 года № 181 «Аб арганізацыі дзейнасці студэнцкіх атрадаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь». Калі раней студэнцкія атрады маглі ажыццяўляць сваю дзейнасць толькі ў перыяд з 1 мая па 30 верасня, то цяпер навучэнская моладзь зможа шчыраваць у складзе студэнцкіх атрадаў круглы год. Такім чынам студатрадаўскі рух у Беларусі, які адзначае сёлета сваё 50-годдзе, атрымаў цудоўны падарунак ад кіраўніка дзяржавы.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

СТАР. 2

ДЗЯРЖАВА ДАПАМОЖА САБРАЦЬ ДЗЯЦЕЙ У ШКОЛУ

Пытанні падрыхтоўкі да новага навучальнага года абмяркоўваліся на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з міністрам адукацыі Сяргеем Маскевічам. Сустрэча прайшла з удзелам першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Радзькова, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Прэзідэнт падкрэсліў, што дзяржава пры неабходнасці гатова дапамагчы сем'ям, выдзеліўшы сродкі на тое, каб сабраць дзяцей у школу. Але сродкі павінны выдзяляцца мэтавым чынам. «Калі трэба камусьці дапамагчы, значыць, трэба дапамагчы непасрэдна дзецям. Таму што вы ведаеце, у якіх бацькоў не хапае сродкаў на тое, каб адзець дзяцей. Большасць з іх, мы ведаем, што гэта за бацькі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы звярнуў асаблівую ўвагу на пытанні бяспекі: у школах з гэтага пункту гледжання ўсё павінна быць зроблена належным чынам і павінны быць няўхільна рэалізаваны адпаведныя даручэнні Прэзідэнта.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў павысіць узровень дысцыпліны і арганізацыі работы ў педагагічных калектывах.

Прэзідэнт даручыў распрацаваць спецыяльную праграму, у якой будуць улічаны патрэбнасці рэгіёнаў краіны ў кадрах з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Размова ідзе аб фарміраванні ўстаноў адукацыі, сучасных каледжаў, якія на высокім прафесійным узроўні павінны рэалізоўваць адпаведныя адукацыйныя праграмы.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на развіцці вышэйшай адукацыі. У прыватнасці, на неабходнасці далейшай зладжанай работы па падрыхтоўцы практыка-арыентаваных спецыялістаў. Міністэрству адукацыі даручана разгледзець пытанне мэтавай кантрактнай падрыхтоўкі для ўдасканалення правіл прыёму ў навучальныя ўстановы.

ДАПЛАТЫ МАЛАДЫМ РАБОТНІКАМ АПК

Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Прэзідэнта, у мэтах замацавання маладых кадраў у АПК Аляксандр Лукашэнка 12 жніўня падпісаў указ № 353 «Аб некаторых мерах па забеспячэнні арганізацый аграпрамысловага комплексу кадрамі».

Дакумент накіраваны на павышэнне гарантаванай заработнай платы шляхам устанаўлення штомесячных даплат.

У прыватнасці, маладым спецыялістам з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, прынятым на работу ў арганізацыі АПК, на працягу двух гадоў іх работы ўстанаўліваюцца штомесячныя даплаты ў двухкратным памеры тарыфнай стаўкі першага разраду, устаноўленай урадам для аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый, з аднясеннем гэтых даплат на затраты па вытворчасці і рэалізацыі тавараў (работ, паслуг), што ўлічваюцца пры падаткаабкладанні.

Кіраўнікам і спецыялістам з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якія адпрацавалі ў арганізацыях АПК два гады па размеркаванні і якія прадаўжаюць працаваць у гэтых арганізацыях на ўмовах заключаных кантрактаў, устанаўліваюцца штомесячныя даплаты на працягу наступных трох гадоў у трохкратным памеры тарыфнай стаўкі першага разраду за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, прадугледжаных на развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці, рыбаводства і перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі.

Гэтыя меры даюць магчымасць забяспечыць гарантаваную заработную плату маладых работнікаў АПК на ўзроўні сярэдняй заработнай платы па гаспадарцы.

Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні родным, блізкім і калегам пісьменніка, журналіста, лаўрэата Ленінскай прэміі Васіля Пяскова ў сувязі з яго смерцю. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы.

«Чалавек вялікага таленту і невычэрпнай творчай энергіі, Васіль Міхайлавіч пакінуў яркі след у расійскай культуры, экалогіі і журналістыцы, — гаворыцца ў спачуванні. — У шматлікіх кнігах, нарысах і тэлеперадачах ён узнімаў вострыя праблемы ўзаемаадносін чалавека з прыродай, захавання для сучасных і будучых пакаленняў багацця Зямлі. Светлая памяць пра Васіля Міхайлавіча Пяскова назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах».

Паритетбанк

www.paritetbank.by

Открытое акционерное общество «Паритетбанк», расположенное по адресу: 220002, г. Минск, ул. Киселёва, 61а, СООБЩАЕТ, что 29 августа 2013 года *в соответствии с решением Наблюдательного Совета ОАО «Паритетбанк» от 12.08.2013, протокол № 16,* ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. О процедурных вопросах.
2. О приобретении банком акций собственного выпуска для последующей продажи государству в лице Национального банка Республики Беларусь.

Собрание проводится по адресу: **г. Минск, ул. Киселёва, 61а, комн. 205.**

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного по состоянию на 14 августа 2013 года.

Регистрация лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, будет проводиться при получении бюллетеней при предъявлении документов, удостоверяющих личность (подтверждающих их полномочия).

Получить бюллетени для заочного голосования и ознакомиться с материалами к собранию участники собрания могут по адресу: г. Минск, ул. Киселёва, 61а, комн. 205 – 22 августа 2013 года и 23 августа 2013 года с 9.00 до 13.00 по месту проведения внеочередного Общего собрания акционеров.

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть возвращены не позднее 26 августа 2013 года по месту проведения внеочередного Общего собрания акционеров, дата подсчета голосов – 27 августа 2013 года.

Принявшими участие во внеочередном Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Паритетбанк» в указанном порядке, которые включаются в одноименный список.

Телефон для справок: 288 64 74.

Правление ОАО «Паритетбанк»

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 08.05.2013 г. № 5. УНН 100233809.

ПРАЦОЎНЫ СЕМЕСТР...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вынікі анкетавання, праведзенага БРСМ сумесна з Міністэрствам адукацыі сярод вучнёўскай і студэнцкай моладзі, сведчаць, што амаль 70% апытаных жадаюць атрымліваць не толькі стыпендыю, але і шукаюць магчымасць паралельна з вучобай падзарабіць. Арганізацыя работы студэнцкіх атрадаў на працягу ўсяго года, а не толькі ў час летніх канікулаў, з'яўляецца адной з самых прыдатных формаў працоўнай занятасці навучэнскай моладзі.

Трэба нагадаць, што леташні Указ кіраўніка дзяржавы «Аб арганізацыі дзейнасці студэнцкіх атрадаў» значна спрасціў фарміраванне студэнцкіх атрадаў і ўзгадненне пераліку аб'ектаў, дзе студэнты могуць і працаваць, і зарабіць, і дзе ёсць работа для студэнцкіх рук. Да таго ж у студэнцкія атрады цяпер могуць уключацца маладыя людзі ва ўзросце ад 14 да 31 года. Гэта значыць, што стаць байцом атрада могуць у тым ліку і непаўналетнія. У мінулым годзе ў летні час у складзе 2040 студэнцкіх атрадаў былі працаўладкаваны 47 863 чалавекі. У 2011 годзе гэтая лічба склала 27,3 тысячы чалавек, а ў 2010 годзе — каля 20 тысяч.

— Прымяненне пры арганізацыі круглагадовай другаснай занятасці моладзі такой формы, як студатрады, дазволіць вызваліць маладых людзей ад выплаты падаткаў, што прадугледжана Падатковым кодэксам для ўсіх удзельнікаў студэнцкіх атрадаў, — патлумачыла журналісту «Звязды» прэс-сакратар Міністэрства адукацыі Юлія Ваніна. — Але хачу падкрэсліць, што паняцце «трэцяга працоўнага семестра», як найбольш актыўнага перыяду дзейнасці студэнцкіх атрадаў (з 1 мая па 30 верасня), усё роўна захоўваецца...

Залічэнне навучэнцаў у студатрады для работы з верасня па май будзе ажыццяўляцца толькі па ўзгадненні з кіраўніком іх навучальнай установы, — удакладніла у міністэрстве. Акрамя таго, указам Прэзідэнта прадугледжана, што правядзенне медыцынскіх аглядаў удзельнікаў студэнцкіх атрадаў і прафілактычныя прышчэпкі будуць ім рабіцца арганізацыямі аховы здароўя на бясплатнай аснове.

Мяркуецца, што новыя ўмовы працаўладкавання прыцягнуць у склад студатрадаў, у тым ліку і будаўнічых, большую колькасць студэнцкай і навучэнскай моладзі, а гэта дазволіць маладым людзям прымаць удзел у рабоце на знакавых будаўнічых аб'ектах Беларусі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ На слыху

ДА АДКАЗНАСЦІ ЗА ПРЫПІСКІ

За прыпіскі ў ходзе ўборкі ўраджаю 8 службовых асоб сельгасарганізацый Магілёўскай вобласці прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе Камітэта дзяржаўнага катролю Беларусі.

Так, Быхаўскі райсельгасхарч у прадстаўленай справаздачнасці завысіў на 639 га не толькі плошчы ўбраных збожжавых культур, але і прыпісаў да іх валавога збору 2835 т збожжа, а таксама павялічыў аб'ёмы нарыхтоўкі сена і сіласу, прыбавіўшы да рэальных «віртуальныя» 4,6 тыс. т і 9,4 тыс. т адпаведна.

Быхаўскі СВК «Следзюкі» завысіў аб'ём намалоту збожжа на 889 т (80 працэнтаў фактычна ўбранага), а СВК «Быхаўскі» — нарыхтоўкі сена на 519 т (95 працэнтаў нарыхтаванага).

У Глускім раёне парушэнні выяўлены ў СВК «Калгас «Слаўгарадскі». У справаздачы райсельгасхарчу гаспадарка наўмысна завысіла ўраджайнасць збожжавых культур на 6 ц/га за кошт заніжэння ўбраных плошчаў і павелічэння на іх валавога збору збожжа.

ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин

информирует акционеров о том, что выплата дивидендов за 2012 год будет производиться с 1 по 30 сентября 2013 года. Дивиденды на 1 акцию составляют 343,77 руб.

Выплата будет производиться зачислением на счета в ОАО «БПС-Сбербанк» г. Жлобин.

Акционерам, приобретавшим акции общества в обмен на ИПЧ «Имущество», зачисление дивидендов производится на лицевые счета в филиалах ОАО «АСБ Беларусбанк» по месту заключения договора на приобретение акций и почтовыми переводами по месту жительства.

Список акционеров на получение дивидендов составляется по данным реестра владельцев ценных бумаг на 1 марта 2013 года.

Дирекция ОАО «БЕЛФА»

УНП 400076540

УБРАНА БОЛЬШ ЯК 80 % ПЛОШЧАЎ ЗБОЖЖАВЫХ І ЗЕРНЕБАБОВЫХ

У гаспадарках Беларусі збожжавыя і зернебабовыя культуры ўбраны больш як з 80 працэнтаў запланаваных плошчаў. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання.

Паводле аператыўнай інфармацыі на 13 жніўня, збожжавыя і зернебабовыя ўбраны аграрыямі з 1860,2 тыс. га, што складае больш як 82 працэнты. Намалочана звыш 6,19 млн т збожжа. Дзяржаве прададзена 757,1 тыс. т, што складае 62,3 працэнта дзяржзаказу.

Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых па рэспубліцы складае 33,3 ц/га, што на 5 ц/га менш, чым на аналагічную дату мінулага года. Найбольш з аднаго гектара атрымліваюць збожжа ў гаспадарках Гродзенскай вобласці — 40,5 ц. У Магілёўскай вобласці гэты паказчык складае 37,1 ц/га, у Мінскай — 36,2 ц/га, Брэсцкай — 32,2 ц/га, Гомельскай — 27,1 ц/га, Віцебскай — 26,5 ц/га. Плануецца, што ў гэтым годзе Беларусь атрымае больш як 9 млн т ураджаю збожжавых з улікам кукурузы.

ДАДАТКОВЫ ЗАРОБАК У г. МІНСКУ

Сацыялагічная служба ажыццяўляе набор супрацоўнікаў для правядзення пакватэрных апытанняў насельніцтва ў г. Мінску. Дадатковы заробак, свабодны графік працы, які дазваляе праводзіць апытанне ў любы зручны час.

Асноўныя патрабаванні: камунікабельнасць, адказнасць, здольнасць выклікаць давер, выразная мова.

Тэлефанаваць з 14.00 да 18.00, акрамя суботы і нядзелі.

Кантактныя тэлефоны: 8 017 203 68 68, 8 029 877 74 68 (МТС), 8 029 303 92 33 (Велком).

Славісты свету збяруцца ў Мінску

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Беларускія навукоўцы ўдзельнічаюць у Міжнародным з'ездзе славістаў з самага яго пачатку — з 1920-х гадоў, таму маюць добры вопыт і высокі ўзровень падрыхтаванасці. Дарэчы, правядзенне такога з'езда — таксама сведчанне прызнання развіцця нашай славістыкі.

Беларускі камітэт славістыкі працуе на базе Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Аднак важна, што нашу краіну будуць прадстаўляць не толькі акадэмікі, але і навукоўцы з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і амаль усіх іншых універсітэтаў краіны.

Старшыня Міжнароднага і Беларускага камітэтаў славістаў Аляксандр Лукашанец пракаментаваў адну з актуальных у нашым грамадстве тэм, якая будзе актыўна асвятляцца таксама і на з'ездзе, — беларускую трасянку:

— Трасянка — гэта не выключна беларуская з'ява. Яна існуе ўсюды, дзе суіснуюць розныя мовы. Гэта праблема — звычайная з'ява ў двухмоўных і шматмоўных грамадствах. Можна прыгадаць літоўскую мову і яе дыялекты, украінскую, таксама мову памежжа Польшчы і Германіі — гэта таксама адлюстравана ў дакладах сёлетняга з'езда.

Дарэчы, беларусістыка вывучаецца ў шэрагу вышэйшых навучальных устаноў розных краін, сярод якіх Японія, Славакія, Польшча, Сербія. А ў Маскве нават быў выдадзены падручнік беларускай мовы для краін СНД. Аляксандр Лукашанец упэўнены, што беларускамоўная кампетэнцыя цяпер даволі высокая, аднак не хапае нацыянальнага моўнага асяродку і звычкі гаварыць па-беларуску.

Намеснік старшыні Міжнароднага камітэта славістаў, галоўны навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Генадзь Цыхун патлумачыў, чаму славянскія краіны часта нават супернічаюць за права правядзення з'езда:

— З'езд славістаў — з'ява даволі рэдкая. І кожнай краіне хацелася б паказаць сваю кампетэнцыю ў гэтай галіне і атрымаць стымул для далейшага яе развіцця і распаўсюджвання ў грамадстве. Мерапрыемства выклікае цікавасць розных краін да мовы, культуры народа, які прымае з'езд. Гэта своеасаблівая прапаганда ўсяго беларускага. Кругагляд славістаў пашыраецца, бо яны сустракаюцца з народам, яго мовай, культурай, фальклорам.

Дарэчы, беларускі фальклор звярнуў на сябе асаблівую ўвагу даследчыкаў, бо ў многіх краінах ён папросту не захаваўся, а ў Беларусі існуе ў аўтэнтычным выглядзе.

Сярод айчынных дакладчыкаў можна адзначыць Міхася Тарэлку, які будзе расказваць пра кітабістыку — навуку пра пісьмовыя помнікі беларускіх татараў, якія напісаны арабскай вяззю, але адлюстроўваюць жывую беларускую гаворку, бо татарская мова ў нас была страчана. Эльжбета Смулкова з Польшчы раскажа пра гаворкі памежжа. Прыедзе і вядомы англійскі даследчык беларускай літаратуры Арнольд МакМілін.

XV Міжнародны з'езд славістаў адкрыты для свабоднага наведвання.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

ЦУКАР... НА ПАЛАЧЦЫ

Гарадзейскі цукровы камбінат пачаў рэалізацыю цукру «Лядзянцовага» на... палачцы.

Як паведамілі ў канцэрне «Белдзяржхарчпрам», незвычайныя бліскучыя цукровыя крышталі на драўлянай палачцы створаны спецыяльна для тых, хто любіць сябе папесціць. Маўляў, гэта не проста цукар, а задавальненне, расцягнутае ў часе. Апусціўшы крышталь у кубак з любімым напоем, павольна памешваючы яго, можна атрымаць асалоду, адчуваючы, як пакрысе цукар аддае сваю салодкасць... Важыць адна штука «Ледзянцовага цукру» 12,5 грама, у спажывецкай упакоўцы іх шэсць. Цана за ўпакоўку (без ПДВ) — 25 050 рублёў. Захоўвацца навінка можа два гады.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Парламенцкія сустрэчы

Галіна ФІЛІПОВІЧ:

«МУЖЧЫНА ЗАЎЖДЫ ПАВІНЕН ІМКНУЦЦА ДА ПЕРШЫНСТВА»

Існуе меркаванне, паводле якога колькасць жанчын у парламенце краіны паказвае ўзровень развіцця грамадства. У ніжняй палаце беларускага парламента пятага склікання 29 жанчын. Многа гэта ці мала? Якая яна, дэпутат Палаты прадстаўнікоў? Якім чынам жанчыны трапляюць на такую складаную працу і як з ёй спраўляюцца? Мы сустрэліся з дэпутатам Галінай ФІЛІПОВІЧ для таго, каб абмеркаваць гэтыя пытанні.

— Галіна Васільеўна, вы вылучаліся ў Палату прадстаўнікоў ад акругі № 46 у Светлагорску. Якія праблемы ў гэтым раёне сёння лічацца найбольш актуальнымі?

— Прасцей за ўсё будзе пачаць з лічбы. За час маёй перадвыбарнай кампаніі ад выбаршчыкаў паступіла каля 70 прапаноў, якія датычыліся самых розных праблем. Найбольш сур'ёзнае, на мой погляд, пытанне — гэта газіфікацыя населеных пунктаў. Сітуацыя такая, што зараз Светлагорскі раён моцна адстае ад іншых рэгіёнаў менавіта па гэтым паказчыку. Наяўнасць газаправода ў доме забяспечвае жыхарам камфорт, не кажучы ўжо пра інтарэсы вытворчасці. Лепшы момант, здавалася б, упусцілі, бо рэалізацыя праграмы развіцця малых гарадоў ужо скончылася.

Але мы актыўна ўзяліся за гэтую праблему, і ўжо зараз ёсць пэўныя вынікі. За маім подпісам былі дасланы просьбы ў Міністэрства энергетыкі, у аб'яднанне «Белпалгаз». Пасля гэтага доўгі час ішлі перамовы, і вось у маі былі дасягнуты канкрэтныя дамоўленасці і выпрацавана стратэгія па газіфікацыі раёна. Будзе пабудавана магістраль Светлагорск — Парычы, якая адразу ж забяспечыць газам палову населеных пунктаў рэгіёна. Першыя вынікі будуць адчувальнымі ў наступным годзе, калі газ з'явіцца ў 418 кватэрах гарадскога пасёлка Парычы.

Ёсць і задачы, што ўжо вырашаны. Былі заключаны дамовы аб пабрацімстве і сяброўскіх адносінах паміж Светлагорскам і крымскімі пасёлкамі Партэніт і Чарнаморскі. Гэта даволі значная падзея ў тым сэнсе, што зараз моцна пашырацца магчымасці адпачынку светлагорскіх дзяцей. Адпачынкам на моры мы паспрабуем заахвоціць таленавітую моладзь раёна. Зараз мы прадумваем і іншыя фарматы супрацоўніцтва з гэтымі населенымі пунктамі.

Актыўная праца ідзе і над ідэяй, якой падзяліліся нашы суайчыннікі з Эстоніі. Гэта ідэя не раённага, а рэспубліканскага маштабу пад назвай «Трывожная кнопка». Сутнасць яе ў тым, што адна з клавіш мабільнага тэлефона праграмуецца на сувязь з дыспетчарскім пунктам. Такім чынам, чалавек, які трапляе ў экстрэмальную сітуацыю і пачынае панікаваць, можа ўсяго толькі націснуць адну клавішу, каб паклікаць на дапамогу. Такой паслугай у іншых краінах карыстаюцца людзі сталага ўзросту, дзеці і цяжарныя жанчыны. З такой прапановай я выходзіла на кіраўніцтва краіны.

— Зараз вельмі актыўна абмяркоўваецца мэтазгоднасць існавання сельскіх Саветаў. Якога меркавання на гэты конт прытрымліваецеся вы?

— Калі казаць пра суб'ектыўнае меркаванне, то я упэўненая ў тым, што сельсаветы нам замяніць пакуль што няма чым. Існуе некалькі нагод для такіх думак. У Беларусі даўно выбудавалася сістэма сувязі народа з уладай. І сельскія Саветы — неад'емная частка гэтай сувязі. Бо ў ідэале ўлада павінна чуць кожнага чалавека. А для гэтага трэба праводзіць асабістыя размовы, сустрэчы, што называецца, «зайсці ў кожную хату». Трэба памятаць: кожнаму чалавеку важна ведаць, што яго чуюць і пра яго ведаюць. Фізічна такая магчымасць сёння ёсць у дэпутатаў мясцовых саветаў. Бо яны жывуць разам з тымі людзьмі, чые праблемы вырашаюць, і яны найбольш адэкватна гэтыя праблемы бачаць.

Акрамя таго, довад аб фінансавай немэтазгоднасці існавання сельсаветаў лёгка разбурыць. Бо на іх дзейнасць не выдаткоўваецца нейкіх глабальных сродкаў, яны працуюць фактычна на ўласнай ініцыятыве. Таму мне здаецца, што праблему мы шукаем не там, дзе трэба. Мы хочам адмовіцца ад сельскіх Саветаў як ад савецкай спадчыны, часам не вельмі прыемнай. Але гэтае мінулае — неад'емная частка кожнага з нас, у гэтым наша адметнасць! Зараз вось мінчане шукаюць для свайго горада брэнд, сімвал. Я думаю, лепшым брэндам магло б быць наша мінулае, як бы мы да яго ні ставіліся. І прыдумваць нічога не трэба, усё ўжо ёсць. Тое самае датычыцца і сельсаветаў.

— Дарэчы, вы тройчы выбіраліся дэпутатам Светлагорскага раённага Савета. Ці вельмі адрозніваецца ваша цяперашняя праца ад мінулай?

— Безумоўна. Па сваёй сутнасці я — хутчэй, стратэг. На месцы ты выконваеш работу, ужо прапісаную законамі, інструкцыямі. А тут ідзе праца над праектамі «з чыстага ліста»: скончыў адзін — пачаў нешта новае.

Калі казаць пра заканатворчасць, то гэта якраз той працэс, які мяне вельмі цікавіць і задавальняе. Калі пачынаеш працу над законам — трэба адразу ж уявіць, што будзе на выхадзе, як згодна з гэтым дакументам будуць жыць людзі. Асабліва цікава, калі думкі нараджаюцца ў дыскусіі людзей, якія прыйшлі з самых розных сфер дзейнасці.

Зараз многа людзей, якія імкнуцца стаць дэпутатамі па самых розных прычынах. І вельмі дрэнна, калі некаму проста хочацца пацешыць сваё эга. І сярод маіх канкурэнтаў былі людзі, якім хацелася задаць пытанне: «Калі ты нічога не зрабіў для сябе, калі ты нічога не зрабіў для раёна, то што ты зробіш для краіны?» Замест таго, каб увесь час жаліцца і быць незадаволеным, трэба хоць што-небудзь годнае зрабіць, і дэпутацкі мандат для гэтага неабавязковы. Бо ў нас хапае звычайных людзей, якія сапраўды робяць шмат «на месцах».

Другая праблема ў тым, каб не «перагібаць палку». Часам здаецца, што калі б нашым людзям далі такую магчымасць, то яны пра кожны свой вугор расказвалі б Прэзідэнту. Трэба вызначаць прыярытэтнасць пытання. Аднойчы я была ў Даніі, нас знаёмілі з сістэмай адукацыі гэтай краіны. Гаспадар, у якога мы спыніліся, за гарбатай расказаў, што ў яго заўжды ёсць магчымасць пазваніць вышэйшаму кіраўніцтву краіны. У нас адразу ж пытанне: «Колькі разоў званілі?». Ён адказвае: «Да каралевы пакуль што не дайшоў, а вось прэм'ер-міністру адзін раз званіў». Пытанне датычылася нестыковак у адукацыйным заканадаўстве, якія заміналі яго працы. Вось такое стаўленне.

— А што такое, увогуле, быць дэпутатам?

— У першую чаргу, гэта адказнасць. Нават падчас працы дэпутатам райсавета. Гэта сітуацыя, калі нельга дазволіць сабе вынесці смецце ў халаце, вобразна кажучы. А тым больш — прайсці па вуліцы ў сваіх думках і не павітацца, бо могуць падумаць: «Зазналася!». Таму гэта яшчэ і вялікая напружанасць.

Мы зараз кажам пра недахоп кадраў і падобныя праблемы. Маё меркаванне: мала людзей, якія згодны браць на сябе адказнасць, а ёсць і тыя, хто яе проста не разумее. Наша праблема ў кадрах грунтуецца на выхаванні.

Асабіста ў мяне ніколі не было нейкага вельмі спрыяльнага асяродку для развіцця: я нарадзілася і жыла ў маленькай вёсачцы, вучылася там жа, а мая маці скончыла ўсяго тры з паловай класы, бо пасля вайны ўзімку не было абутку, каб у школу пайсці. Былі толькі нейкія маральныя прынцыпы і запаветы, дагэтуль карыстаюся такім: «Працуй так, каб ніхто не перарабляў пасля цябе». Усё астатняе мне далі газетныя развароты пра будаўнікоў БАМа, герояў Афганістана... Мы нейкім чынам гэта страцілі. Замест узвышаных матэрыялаў пра вялікіх людзей збіваемся на крымінальныя зводкі, дзе ні пра якую адказнасць і размовы не ідзе. Некаторыя сродкі масавай інфармацыі ператвараюцца ў «Энцыклапедыю забойцы-пачаткоўца». Адсутнасць маральных арыенціраў — вось наша праблема. Чалавек павінен сам сябе выхоўваць, але трэба ж і нейкі асяродак ствараць.

— Акрамя дзейнасці ў Палаце прадстаўнікоў, вы ўзначальваеце раённую арганізацыю Беларускага саюза жанчын. Як думаеце, тое, што ў Парламент зараз трапляе даволі шмат прадстаўнікоў «слабога полу» — паказчык маральнага росту грамадства?

— Безумоўна, гэта вельмі добра. Нават банальнае захаванне балансу інтарэсаў можна забяспечыць такім чынам, бо на ўсе праблемы трэба глядзець як з мужчынскага, так і з жаночага боку, каб потым не прыходзілася вяртацца і запаўняць прабелы. Хто б там што ні казаў, мужчына і жанчына — гэта зусім рознае. Не на пустым месцы ж узніклі стэрэатыпы пра жаночую логіку і мысленне. Акрамя таго, аднаполы калектыў, як мне здаецца, расхалоджвае, асабліва «моцны пол», які павінен заўжды імкнуцца да першынства.

У той жа час, асабіста мне, нягледзячы на адказнасць і сур'ёзнасць цяперашняй працы, заўжды хацелася папрацаваць намеснікам якога-небудзь сапраўды моцнага мужчыны. Думаю, любой жанчыне прыемна адчуваць сябе пад абаронай — як фізічнай, так і маральнай. Нават на працы. Шкада, што такіх моцных мужчын зараз становіцца ўсё менш.

Таму жанчыны, я думаю, павінны прысутнічаць у парламенце. А вось у якой ступені — вырашаць мужчынам! *(Смяецца.)*

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ

■

■ Свая справа

МАСКАРПОНЕ ПА-СЛАЎГАРАДСКУ

Сырныя серады арганізуе на рынку ў Слаўгарадзе клуб сыравараў «Сялянка»

Серада — вялікі базарны дзень у раённым цэнтры. Раз на тыдзень гандляры з усёй акругі збіраюцца раніцай у Слаўгарадзе, каб прапанаваць людзям прадукты, адзенне і розныя гаспадарчыя тавары. Праз натоўп патэнцыйных пакупнікоў трэба праціснуцца да крамы раённага спажывецкага таварыства «Сельгаспрадукты», каб патрапіць на дэгустацыю хатніх сыроў мясцовай вытворчасці. За прылаўкам — Галіна ТАРАН са Слаўгарада, якая займаецца сырамі з казінага малака.

— Паспрабуйце майго маскарпоне, — запрашае гаспадыня.

Маскарпоне — гэта сметанковы сыр, які паходзіць з Італіі. Галіна робіць яго на слаўгарадскі лад.

— Я дадаю ў гэты сыр лімонны сок, ванілін і цукровую пудру, таму ён салодкі, як дэсерт, — расказвае яна пакупнікам.

З паловы літра казінага малака атрымліваецца адна порцыя маскарпоне ў выглядзе кветкі, дзе ў сярэдзіне каляровы кавалак цукатаў. Гэтая прыгажосць і смаката каштуе 5 тысяч рублёў. Заморская назва не пужае маленькага хлопчыка Платона, які выразна кажа сваёй бабулі патрабавальнае «няма-няма».

— Людзі ў нас цудоўна ведаюць усе віды сыроў з рознымі цікавымі назвамі, — кажа Галіна. — Я таксама раблю казіную брынзу і рыкоту, ды з сучаснай халадзільнай шафай і давала магчымасць добра зарабляць на продажы сваіх сыроў. Цяпер такое месца ёсць, і кожную сераду жанчыны напаўняюць вітрыну сваёй прадукцыяй з фірменнымі наклейкамі ад клуба «Сялянка».

Сыры самыя розныя, але ўсе карыстаюцца попытам. Актуальны для ўсіх кошт — 60 тысяч рублёў за кілаграм. Прадукцыя экалагічна чыстая, карысная для здароўя і вельмі смачная. Праверана на дэгустацыі!

Сыраробства дае добры прыбытак. Тамара падлічыла проста: калі здаць вядро малака, то яна атрымае каля 30 тысяч рублёў, а калі зрабіць з гэтага малака кілаграм сыру, то прадаць яго можна ўдвая даражэй. Безумоўна, частка выручкі павінна пайсці на кармы для жывёлы, але грошы застаюцца і для сябе. Дык чаму ж не вырабляць хатні сыр?

— Спачатку сыраробства было маім хобі, — расказвае пра сваю матывацыю Галіна Таран. — А цяпер сапраўды з'явілася магчымасць зарабіць. Сыры сталі папулярнымі, мы ледзь паспяваем іх гатаваць. Давядзецца павялічваць вытворчасць малака: у мяне цяпер 4 дойныя казы, трэба яшчэ адну. Я, вядома, маю месца працы, але сыраробства дае мне штомесяц прыкладна яшчэ траціну ад майго асноўнага заробку. Так што карысць ёсць!

— Мы вельмі заклапочаны тым, каб да нас у клуб сыравараў прыходзілі новыя людзі, моладзь, — гаворыць Таццяна Гурына. — Мы расказваем пра хатняе сыраробства на сустрэчах з людзьмі ў вёсках. Для таго, каб прадукцыя была добрай і смачнай, сыравару трэба мець малако высокай якасці. Таму мы дапамагаем людзям з пазыкамі, каб набыць карову. Нядаўна жанчына ў Папоўцы набыла яшчэ дзвюх кароў, можа, і ў яе справа пойдзе. Вельмі добра, калі людзі працуюць, зарабляюць і ад гэтага жывуць лепш.

Ілона ІВАНОВА.
Фота аўтара.

г. Слаўгарад

■

Энтузіясты пачалі са збірання рэцэптаў і знайшлі гаспадароў, якія захавалі старажытныя традыцыі сыраварства.

Ініцыятарам адраджэння і развіцця хатняга сыраробства ў Слаўгарадскім раёне стаў **мясцовы фонд развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэнне-Агра».** Актывісты пачалі са збірання рэцэптаў і знайшлі гаспадароў, якія захавалі старажытныя традыцыі сыраварства.

— Першай была жыхарка вёскі Гіжэнка Людміла Ерафеева, — расказала **дырэктар фонду Таццяна ГУРЫНА.** — Калі яна набыла кароў, то стала рабіць сыр, як яе вучыла маці. Гэты вясковы сулугуні нам усім вельмі спадабаўся. Так і нарадзіўся праект, накіраваны на аднаўленне старадаўняга сыраробства. Я таксама гатую, як калісьці мая бабуля і маці, сырніцу і сырныя аладкі. Кожны ідзе сваім шляхам, і ў нас разам усё атрымліваецца.

Жанчыны прайшлі навучанне і ўрэшце аб'ядналіся ў клуб сыравараў «Сялянка». З іх ініцыятывы і з падтрымкай улад у Слаўгарадзе нарадзіўся сырны фэст «Гаспадарчы сыр», дзе сыравары прапаноўваюць сваю разнастайнасць прадукцыі: брынзу, сулугуні, плаўленыя сыры, салодкія, салёныя, вострыя, з макам, з кмінам і гэтак далей.

Але ўдзельнікі клуба марылі пра сваё месца на рынку ў раённым цэнтры, якое было б абсталявана рознымі прыправамі, нават з шашлычнай сумессю для аматараў піва альбо з вострым перцам. Ёсць нават варыянт для дыябетыкаў. І ведаеце, усё карыстаецца добрым попытам. Прычым многія людзі замаўляюць прадукцыю оптам — для свят альбо для усёй сям'і. Гэта карысная і смачная ежа!

Тамара ТВЯРДОЎСКАЯ вырабляе хатні сыр з каровінага малака. Гаспадыня з вёскі Рудня паказвае прывабныя жоўтыя сырныя галоўкі. На адну такую патрабуюцца 10 літраў малака.

— Гэта цалкам натуральны прадукт, — кажа Тамара. — Там толькі малако, некалькі лыжак солі і крыху воцату. У яго смак таплёнага малака, і людзі гэта любяць. Калі замаўляюць, то адразу па 3-5 кілаграмаў, асабліва жыхары вялікіх гарадоў, якія прыязджаюць да сваякоў і сяброў на Слаўгарадчыну. Вядома, там такога сыру не купіш!

■ Грыбныя гісторыі

ЛЕПШЫ ЛЯСНЫ «АНТЫДЭПРЭСАНТ» — ЛІСІЧКІ!..

«Ціхае паляванне» — улюблёная справа многіх людзей. І ўзрост тут не адыгрывае асаблівай ролі — было б жаданне і, зразумела, лес. У некага грыбны сезон пачынаецца яшчэ вясной, калі з'яўляюцца першыя смаржкі, а нехта аддае перавагу больш «традыцыйным» грыбам, якія пачынаюць расці пасля першых летніх дажджоў. Так ці інакш, пры жаданні грыбы ў нашых лясах можна збіраць ці не з красавіка — і пакуль не выпадзе снег. Амаль заўсёды ў гэты час можна сустрэць лісічкі. Першыя такія грыбы сустракаюцца ўжо ў канцы мая — пачатку чэрвеня. І працягваюць расці ажно да маразоў!

Я люблю збіраць грыбы з дзяцінства. Колькі смачных страў з іх можна прыгатаваць! І грыбны суп зварыць (каронная страва маёй бабулі), і квас, і пасмажыць... Але вось лісічкі ў сферу маіх густаў не ўваходзяць: хто часта гатуе стравы з грыбоў, пацвердзяць — смак у іх даволі-такі спецыфічны, не такі, як, напрыклад, у белых грыбоў, абабкаў, маслякоў, ці нават сыраежак. Тым не менш, збіраць я іх люблю, бо ў лесе яны амаль заўсёды ёсць. Нават у спякотную пару.

Калі збіраеш грыбы, ходзіш па лесе, думкі неяк ачышчаюцца і розныя «невырашальныя» праблемы адыходзяць на другі план. Таму лісічкі з дзяцінства сталі для мяне своеасаблівым «антыдэпрэсантам». А назбіранае я і зараз часта адвожу ў суседні ад вёскі Трасцянка, у якой жыве мая бабуля, пасёлак Лагішын. Як правіла, «ураджай» у мяне традыцыйна не вельмі вялікі. Калі адна хаджу, то прыношу дадому кілаграмы два-два з паловай. Калі ідзём разам з бабуляй, то набіраем і пяць кілаграмаў. Гэта смешныя дасягненні ў параўнанні з ураджаем іншых грыбнікоў, але, на маю думку, грыбы — гэта якраз тая справа, дзе галоўнае — сам працэс.

— Па-рознаму людзі прыносяць, — стараецца не пакрыўдзіць нічыю працу прыёмшчык. — Хтосьці кілаграм, а некаторыя — і па пятнаццаць. Вось мой сусед учора прынёс адзінаццаць кілаграмаў!

Мне гэта нават здаецца трошкі неверагодным. Адзін — і столькі набраць! І ў што ён збіраў? Відаць, быў на машыне. Бо ў мой кошык змяшчаецца максімум тры з паловай кілаграмы. Не мог жа ён хадзіць з чатырма кашамі!

Але бабуля, якая ведае лепш за мяне грыбныя мясціны суседняга Лагішына (дзе і жыве той сусед), развейвае мае сумненні.

— Мабыць, ён на П'яную (мясцовы тапонім. — **Аўт**.) ездзіў. Там, кажуць, лісічак хоць касою касі. Усё рыжае!

Вось і сёлета ў адным з маіх надзейных лясных «агародаў» дзікі добра так пагаспадарылі. На шчасце, грыбніцу яны не з'елі, таму лісічкі растуць нават на разрытым моху.

Я не перастаю па-добраму зайздросціць таму суседу. Відаць, гэта пачуццё знаёмае кожнаму грыбніку: знайсці такую мясціну, дзе грыбоў — куды вока кінь! І якую ніхто не ведае. Але пра сябе прыкідваю, што, калі б я была больш старанная, то таксама магла б набраць куды больш. Усё ж такі мой стандартны паход у лес не цягнецца больш за дзве — максімум тры гадзіны. А для вопытных грыбнікоў і дня мала.

Шмат гісторый і незабыўных уражанняў звязана з грыбамі ў цэлым і лісічкамі ў прыватнасці ў кожнага, хто любіць «ціхае паляванне». Вось адзін з маіх першых «грыбных» успамінаў.

...Мне, можа, гады тры-чатыры. З бабуляй мы пайшлі ў лісічкі ў лес, які тут, у нас, вядомы пад назвай «горы». Сапраўды, там ёсць узгоркі, што даволі-такі незвычайна для раўніннага Палесся. Але большасць «гор» — вынік Вялікай Айчыннай вайны: гэта тое, што засталося пасля бамбёжак. Зараз там вырас лес, і на схілах узгоркаў, а таксама ў пракапаных калісьці траншэях ужо колькі гадоў растуць лісічкі.

Нягледзячы на тое, што лес пачынаецца адразу за бабуліным агародам, ісці ў горы было далекавата. І неяк так атрымалася, што мы трошкі заблудзілі. І ўсё было б добра, дарога знайшлася б. Але неспадзявана пачалася навальніца. Мая бабуля не разгубілася, распранулася ледзь не да бялізны і захінула мяне ў сваю адзежыну, каб я не намокла і не захварэла. Далей мы выйшлі на шашу — а яна праходзіць акурат праз нашу вёску. Бабуля «прагаласавала», і спынілася вялікая фура. Шафёр хоць і смяяўся з незвычайнага нашага выгляду, але падвёз пад самы дом. Пасля смяялася мама, якая не пайшла з намі ў лес.

Дарэчы, у мамы таксама ёсць свая «грыбная» гісторыя. Неяк у маленстве яны з сястрой Таццянай, маёй цёткай, наслухаўшыся гісторый ад аднакласнікаў пра тое, хто і колькі знайшоў грыбоў, вырашылі пасля школы выпрабаваць сваё «лясное» шчасце. Бабуля ў гэты час была на працы, таму ніяк іх дзеянні пракантраляваць не магла. Дзяўчаты заблудзіліся. І блукалі доўга. Нарэшце, выйшлі да вёскі, якая знаходзіцца даволі-такі далёка ад Лагішына. На шчасце, мясцовыя купілі ім білеты на аўтобус, і вечарам (хоць і даволі позна) яны былі дома. А яшчэ неяк па тэлебачанні расказвалі пра аднаго такога палескага грыбніка, што ненаўмысна перайшоў мяжу з Украінай. Вось гэта паход у грыбы!

Але не заўсёды «грыбныя» гісторыі ўспамінаюцца толькі з вясёлым смехам. Лес — гэта не садок за хатай, але і дом для многіх лясных жыхароў. У нашых лясах жывуць лосі, казулі, зайцы, лісы, дзікі (іх асабліва шмат), а з нядаўняга часу — і бабры. І трэба пра звяроў памятаць і, што называецца, «не нарывацца». Вось такую гісторыю расказваюць у нашай вёсцы пра вельмі ўжо вопытнага грыбніка, які паплаціўся жыццём за сваю апантанасць.

Большасць «гор» — вынік Вялікай Айчыннай вайны: гэта тое, што засталося пасля бамбёжак. Зараз там вырас лес, і на схілах узгоркаў, а таксама ў пракапаных калісьці траншэях ужо колькі гадоў растуць лісічкі.

Як я ўжо пісала, лісічкі любяць расці на розных схілах: у ямках ад ваенных акопаў, траншэях... Дык вось, часта там жа вырываюць сабе норы лісы. Грыбнік з Пінска збірае сабе грыбы і бачыць, што невялікая сямейка ўпадабала месца якраз над свежай лісінай норай. Ён пацягнуўся за імі — і быў атакаваны... раззлаванай лісой, якая пракусіла яму шыю і перагрызла сонную артэрыю. Відаць, яна падумала, што мужчына цягнецца за ёю. А можа, што найбольш верагодна, ліса была проста шалёнай. Народны эпас такой інфармацыі не захаваў.

«Прагуляцца» па грыбных мясцінах любяць і «кампаніі» дзікоў — яны часам бываюць сапраўдным лакальным бедствам для жыхароў лясных палескіх вёсачак: то «нападуць» на палеткі з бульбай і ўсё перакапаюць, то дабяруцца нават да агародаў — іх прагулкі па грыбных мясцінах таксама не вельмі «акуратныя». Вось і сёлета ў адным з маіх надзейных лясных «агародаў» дзікі добра так пагаспадарылі. На шчасце, грыбніцу яны не з'елі, таму лісічкі растуць нават на разрытым моху.

Лісічкі можна здаць у спецыяльныя закупачныя пункты, якія ёсць ці не ў кожнай вёсцы. Сёлета іх пачалі прымаць з сярэдзіны чэрвеня, а збіраць гэтыя грыбы аматары маглі ўжо ў самым пачатку першага летняга месяца. Што да цаны, то яна ўвесь час вагаецца. Так, на Піншчыне лісічкі пачалі прымаць па 25 тысяч рублёў за кілаграм, але пасля дажджоў цана ўпала да 15-20 тысяч.

Чаму менавіта лісічкі, а не сыраежкі, не белыя грыбы (тыя таксама ж можна здаваць) карыстаюцца такой папулярнасцю ў закупшчыкаў? Усё проста. Лісічка — гэта, здаецца, адзіны ў нашым рэгіёне грыб, які не чарвівее. Уся справа ў тым, што ў лісічках ёсць спецыяльнае рэчыва (хіцінманоза), якое разбурае капсулы яек розных чарвякоў і такім чынам не дае ім развівацца. Па гэтай прычыне такія грыбы ў вялікай колькасці закупляюць замежныя фармакалагічныя кампаніі і для вырабу з іх розных лекаў. Рэчывы, якія ёсць у лісічках, дапамагаюць пры захворваннях печані, вельмі карысныя пры захворваннях вачэй, асабліва пры так званай «курынай слепаце». Таксама гэтыя грыбы могуць прынесці карысць людзям, што хварэюць на туберкулёз, бо менавіта лісічкі маюць у сваім саставе рэчывы, якія блакіруюць рост туберкулёзнай палачкі. Вось такія яны прыгожыя і карысныя — лісічкі!

Надзея ЮШКЕВІЧ

■ Футбол

БАЛКАНСКІ ГОСЦЬ

Сёння ў Жодзіне зборная Беларусі правядзе таварыскі матч з нацыянальнай камандай Чарнагорыі. Пачатак сустрэчы ў 18:30.

Георгій КАНДРАЦЬЕЎ хоча ўбачыць у дзеяннях падапечных змястоўны футбол.

Апошні раз зборная Георгія Кандрацьева збіралася разам яшчэ ў чэрвені, калі двойчы ў межах адборачнага турніру першынства свету сустракалася з Фінляндыяй. Так, тады Беларусь згуляла непераканаўча. У дзвюх сустрэчах з камандай сярэдняга ўзроўню беларусы атрымалі толькі адзін бал і зараз знаходзяцца на апошнім радку сваёй падгрупы. У будучым нашых хлопцаў чакаюць матчы з французамі, іспанцамі, але пакуль трэба добра на сваім полі згуляць з Чарнагорыяй, каб паспрабаваць аднавіць рэпутацыю ў вачах балельшчыкаў.

Чарнагорцы — прадстаўнікі югаслаўскай футбольнай школы. Тамтэйшы клубны футбол пакуль не можа пахваліцца добрымі вынікамі на еўраарэне, але зборная ўжо ўваходзіць у трыццатку лепшых каманд свету. Сярод лідараў калектыву, якім на трэнерскай пазіцыі дырыжыруе Бранка Брновіч, нападаючы італьянскага «Ювентуса» Мірка Вучыніч, форвард англійскага «Манчэстэр Сіці» Стэван Явеціч, абаронца французскага «Ліля» Марка Баша. Магчыма, выйдуць на поле супраць беларусаў і знаёмыя нашаму аматару гульцы — Марка Сіміч, які мае добры досвед выступленняў за БАТЭ, а таксама паўабаронца мінскага «Дынама» Неманья Нікаліч.

Да гульні з балканцамі ў беларускім стане рыхтуецца 21 футбаліст. З-за пашкоджання ў складзе адсутнічае нападаючы Віталь Радзівонаў, а абаронца Максім Бардачоў папрасіў у трэнера зборнай адпачынак. Прычына ў Максіма важная: Бардачоў адправіўся ў Расію, каб падпісаць кантракт з томскай «Том'ю». Праграму па падрыхтоўцы да гульні зборная распачала яшчэ ў панядзелак вечарам. Футбалісты ў лёгкім тэмпе трэніраваліся на полі каля футбольнай федэрацыі, гулялі ў рухомыя гульні, разыгрывалі так званыя «квадраты».

— Чарнагорыя — гэта моцны сапернік. Нас чакае цікавы спарынг, — **пасля трэніроўкі карэспандэнту «Звязды» прызнаўся Антон Пуціла, паўабаронца нашай зборнай і ніжагародскай «Волгі»**. — А такія прозвішчы футбалістаў, як Явеціч і Вучыніч, кажуць насамрэч пра многае. Безумоўна, хочацца забіць у гэтым матчы, аднак галоўнае — перамагчы, выканаць задачы трэнера.

Падчас трэніроўкі.

— У верасні беларусаў чакае адборачны матч са зборнай Францыі. Ці можна гэты матч лічыць падрыхтоўкай да гульні з «трохкаляровымі»?

— Стылістычна гэта дзве розныя зборныя. У гэтым матчы мы здолеем праверыць свае сілы, аднак па-ядынак з французамі — ужо іншая гісторыя.

— Гуляць прыйдзецца на невялічкай арэне ў Жодзіне. Ці ёсць спадзяванні на аншлаг?

— Будзе вельмі добра, калі падтрымаць нас сабярэцца ўвесь стадыён. Мы будзем толькі рады гэтаму.

— На сустрэчы з Фінляндыяй у Гомелі было таксама шмат балельшчыкаў. Мяркую, што і на гэты матч прыйдзе шмат людзей, каб падтрымаць сваю зборную, — дадае паўабаронца БАТЭ і нацыянальнай каманды Эдгар Аляхновіч.

Тарас ШЧЫРЫ.
Фота аўтара

■ Традыцыі

ДЗЕНЬ СА СМАКАМ МЁДУ

Пачатак Спасаўкі — самага «салодкага» посту года

Духмяны, цягучы, бурштынавы, салодкі... Яго можна есці, ужываць як лекі ці нават піць. Усё гэта пра мёд. Карысны прадукт, усе ведаюць. Можа, таму яму прысвяцілі асобнае свята. 14 жніўня ўсе ўзгадваюць пра мёд. Мёд новага збору становіцца галоўным прадуктам, і гэта, згодна з традыцыяй, у нас імкнуцца асабліва адзначыць. Па ўсёй краіне ў цэрквах у гэты дзень бласлаўляюць мёд. Пры тым, што ў гэтага дня сапраўды адметнае паходжанне: сышліся святы як царкоўныя праваслаўныя (а іх адразу некалькі), так і народныя. Таму што ў гэты час яшчэ адзначаўся і Макавей — стравы з макам раней былі на стале. А яшчэ і лекавыя зёлкі асвячалі ў гэты летні дзень. Аднак жа мёд застаецца ці не галоўным прыродным ласункам дагэтуль.

І ўсе да гэтага дня імкнуцца мёдам разжыцца. Дапамагчы ў гэтым павінны кірмашы, дзе прадаюць мёд. Але мядовыя святы з кірмашамі (асабліва ў вялікіх гарадах) — гэта ўжо і культурная традыцыя. Напрыклад, Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь на пляцоўцы перад уваходам ладзіць народнае свята «Мядовы Спас». На дапамогу ў яго арганізацыі ўзялі гандлёвы дом «Свет пчол»: свята не толькі ў гонар мёду, але і з мёдам павінна быць, каб людзі маглі запасціся ім на ўвесь год. Але як набыць, калі не пакаштаваў? Дэгустацыя мёду — вельмі прыемная частка свята. Каштаваць давядзецца мёд беларускіх і расійскіх пчаляроў. І нягледзячы на тое, што пераконваць у карысці гэтага прадукту нікога не трэба, але кансультацыю апітэрапеўта таксама можна будзе атрымаць: як, калі і які мёд ужываць у залежнасці ад той ці іншай сітуацыі. Але ж не толькі яго: пчаляры — людзі дбайныя, нічога не прападае ў іх вытворчасці, і сваю карысць маюць іншыя прадукты пчалярства — такія, як праполіс ды пярга. А то і яшчэ мядовай касметыкай можна разжыцца прыгажуням.

Усё-такі нездарма пчолкі лічацца вельмі працавітымі істотамі (столькі дабра людзям ад іх). Таму ў гонар гэтай Боскай істоты — дзіцячы конкурс малюнкаў на асфальце «Залатая пчолка» (з салодкімі прызамі). Для дарослых — канцэрт гурта «Беларуская брама» і прэзентацыя кнігі «Радавод сонечнага племені» (аўтары У. Гуркоў і С. Цярохін) з прадмовай пісьменніка і літаратуразнаўцы Яўгена Лецкі. Шмат можна расказаць пра мёд і стаўленне да яго спрадвеку беларусаў, якія ўмелі працаваць гэтак жа руплівa, як пчолкі. Але ніколі не забывалі, што Мядовік — гэта першае свята, якое пачынала летні двухтыднёвы пост, які называлі «Спасаўка».

Гэта значыць, што ёсць час падумаць пра тое, што ратуе не толькі цела, але і душу. А ў гэты жнівеньскі дзень царква адзначае свята асаблівага пакланення Жыватворнаму Крыжу, чым заклікалі ў дапамогу сілу Збавіцеля. Крыж выносілі на вуліцы і дарогі — каб адвесці ўсё дрэннае ад людзей. Свята, якое было ўсталявана яшчэ ў Візантыі ў IX стагоддзі. Але з гэтага дня пачынаецца падрыхтоўка да свята Успення Прасвятой Багародзіцы — праз двухтыднёвы строгі пост да 28 жніўня. І вось тут мёд новага збору вельмі дарэчы. І гэта ўжо не проста ласунак, але і дар Боскі, міласць да тых, хто верыць у тое, што ў гэтым свеце ўсё ўсталявана так, каб у чалавека быў штодня «хлеб надзённы» і штосьці да хлеба. І мёд — на ўвесь год...

Ларыса ЦІМОШЫК.

МАРШРУТ праз стагоддзі

У апошні тыдзень жніўня ад сцен Мінскага Свята-Духавага кафедральнага сабора адправіцца па маршруце дваццатая Міжнародная навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да святыняў» з Дабрадатным Агнём ад Гроба Гасподняга, якая з'яўляецца састаўной часткай дзяржаўнага свята «Дзень беларускага пісьменства». Маршрут гэтай экспедыцыі пройдзе праз многія гарады і вёскі Мінскай, Брэсцкай, Магілёўскай абласцей. Усюды, куды завітаюць паломнікі, адбудуцца ўрачыстыя набажэнствы, мясцовыя жыхары пачуюць выступленні вядомых святароў, навукоўцаў, пісьменнікаў, артыстаў. І самае галоўнае — у кожным населеным пункце жыхары атрымаюць магчымасць запаліць свае свечкі ад прынесенага з Іерусаліма цудадзейнага агню.

НА ЗДЫМКАХ:
Капліца на Святым полі пабудавана сярод былых акопаў.
Кіраўнік экспедыцыі пісьменніца Ніна ЗАГОРСКАЯ гутарыць са старшынёй Сталовіцкага сельсавета Ірынай ПАЛЬЧЫК.
— На Святым полі дагэтуль можна знайсці асколкі снарадаў і кулі, — гаворыць удзельнік экспедыцыі Міхась ЗАГОРСКІ, дзяцінства якога прайшло ў гэтых мясцінах.
Экспедыцыя пабывае і там, дзе захаваліся інжынерныя пабудовы часоў Першай сусветнай вайны.

Маршрут экспедыцыі ўзгоднены з дзяржаўнымі органамі і кіраўніцтвам беларускай праваслаўнай царквы. Расклад сустрэч з жыхарамі, наведванне ўстаноў адукацыі і культуры, малебны ў храмах — усё пазначана ў шматдзённым сцэнарным плане экспедыцыі з дакладнасцю да хвілін. Такую дакладнасць забяспечвае складаная праца арганізацыйнай групы, якая ў гэтыя дні апошні раз удакладняе планы ва ўсіх намечаных гарадах і вёсках.

З гэтай мэтай арганізацыйная група днямі наведала Баранавіцкі раён. На тэрыторыі гэтага раёна знаходзіцца Святое поле — так называюць тут месца, дзе ў розныя часы знаходзіліся франты шматлікіх войнаў, абпаліўшых беларускую зямлю. На Святым полі сярод былых акопаў трыццаць гадоў таму быў знойдзены цудатворны Загор'е-Сталавіцкі абраз Пакрова Прасвятой Багародзіцы. Гэты абраз вось ужо дваццаць гадоў нясе з сабой экспедыцыя "Дарога да Святыняў".

Як лепш арганізаваць працу экспедыцыі — пра гэта раілася арганізацыйная група на сустрэчы з кіраўніцтвам Баранавіцкага раёна. Удзел у размове прымалі таксама прадстаўнікі мясцовых арганізацый і прадпрыемстваў. Дапамога раённай улады і мясцовага кіравання дазволіць найбольш поўна выканаць не толькі сёлетні сцэнарый экспедыцыі, але і намечанае на шмат гадоў наперад. Гэта датычыцца Святога поля, дзе пабудавана капліца, пастаўлены памятныя крыжы, пасаджаны алеі.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Коралл» (продавец)

извещает о проведении 16 сентября 2013 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-8

№ лота	Наименование	Адрес объектов	Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб.	Задаток, с учетом НДС, бел. руб.
1	Капитальное строение (здание кислородно-компрессорной станции), инв. № 350/С-44942, пл. 3903,6 кв.м	г. Гомель, ул. Лепешинского, 7	4 530 850 000	450 000 000
2	Капитальное строение (здание столовой на 550 мест), инв. № 350/С-49975, пл. 3297,3 кв.м, склад металлический пл. 72 кв.м, асфальтированные тротуары столовой пл. 2150 кв.м. Здание оборудовано электрическими щитами и тремя грузовыми лифтами		7 300 000 000	730 000 000
3	Изолированное нежилое помещение (здание главного корпуса), инв. № 350/D-149240 пл. 52440,4 кв.м, галерея между главным и стекольным корпусом пл. 326,5 кв.м, навес железобетонный пл. 350,5 кв.м		58 993 400 000	5 800 000 000
4	Незавершенное законсервированное капитальное строение (выносная камера кондиционирования), инв. № 350/U-129007 пл. 800,4 кв.м		2 465 160 000	246 000 000

Продавец: Открытое акционерное общество «Коралл». 8044 4574730.

Шаг аукционных торгов – 5%.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет продавца (ОАО «КОРАЛЛ») № 3012111889019 в Региональной Дирекции № 300 ОАО « БПС-Сбербанк», УНП 400051785, МФО 153001369 **по 12 сентября 2013 года в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель **по 12 сентября 2013 года в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения.**

К заявлению прилагаются следующие документы:

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

Земельный участок под объект продажи будет выделен по заявке нового собственника, согласно законодательству Республики Беларусь.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона (имущество продаются одним лотом) продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Организатор торгов может отказаться от их проведения за 3 дня до даты проведения торгов.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 59 73 и на сайте gomeloblreklama.by

■ Беларускія гарнізоны

ВІЦЕБСК – ДЭСАНТНАЯ СТАЛІЦА. І ГАВАНЬ МАРАКОЎ

Віцебск — старажытны беларускі горад. Радзіма сусветна вядомага Марка Шагала. Яшчэ ў савецкі час горад на Дзвіне лічылі своеасаблівай сталіцай паветрана-дэсантных войск: тут стаяла дывізія ПДВ. І яшчэ адна дывізія была ў горадзе — ваенна-транспартная. Адразу дзве на адзін абласны цэнтр.

Далёкае мінулае

Мастацтвазнаўцы сцвярджаюць, што героямі першых работ маленькага Шагала сталі віцебскія вайскоўцы. Сям'я мастака жыла на Пакроўскай, побач з казармамі. І хлапчук маляваў тое, што там бачыў. Пад уплывам суседзяў, відаць, і працу выбраў — у 1916 годзе падаўся служыць у ваенна-прамысловы камітэт.

— Горад наш пачынаўся як замак, — распавядае мясцовы гісторык Валерый Шышанаў. — Як крэпасць старажытнарускіх княстваў. У Віцебску збудавалі адну з найлепшых крэпасцяў таго часу.

У 1772 годзе ў горадзе з'явіўся Вісцызкі батальён, праз два гады перайменаваны ў Віцебскі. Пасля батальён стаў палком. Яго найменне можна ўбачыць на мемарыяльнай дошцы ў цэнтры Севастопаля — у пераліку тых, хто асабліва вызначыўся падчас Крымскай вайны.

Плануючы кампанію 1812 года, Напалеон лічыў захоп Віцебска адной з найважнейшых задач. Меркаваў зрабіць у горадзе Стаўку і затрымацца, каб сабраць сілы для далейшага паходу. Але вельмі цяжкія баі пад Полацкам і Астраўно і ўдалае злучэнне рускіх войскаў ля Смаленска прымусілі Банапарта пакінуць Віцебск заўчасна.

З 1884 года ў горадзе стаў ленкаранскі полк. Калі ўспыхнула вайна на Каўказе — яго кінулі туды. Разгарэлася руска-японская вайна — і на Далёкім Усходзе без віцебскіх ленкаранцаў не абышлося.

Сёння аб палку нагадваюць толькі старыя казармы. Будавалі іх надзейна, грунтоўна — яшчэ нядаўна там знаходзілася сучасная ваенная камендатура.

Дэсантная эпоха

У 1945-м у горад прыслалі дэсантнікаў. Цэлую дывізію — гвардзейскую. Якую ў час новай вайны планавалася дэсантаваць з самалётаў — і салдат, і баявую тэхніку. Для чаго на складах ляжала патрэбная экіпіроўка, уключаючы пагрузачныя рампы і велізарныя грузавыя парашуты на кожную баявую машыну. Амуніцыі назапасілі столькі, што беларускія вайскоўцы пасля замучыліся вывозіць з Віцебска гэты рыштунак, які стаў непатрэбным.

Мець вайсковы дэсант — дарагая справа. Туды і людзей трэба адмысловых, і тэхніку адпаведную. Такая багатая і амбіцыйная ў ваенным сэнсе краіна, як Францыя, змагла сабе дазволіць трымаць толькі адну паветрана-дэсантную дывізію. СССР меў іх ажно сем.

Нядаўна з жыцця пайшоў Яўген Гаравы, які прызываўся ў Віцебскую дывізію ў пяцідзясятых звычайным радавым. І заканчваў служыць там жа, у 103-й гвардзейскай, падпалкоўнікам.

— Сапраўды напружаная служба. Мы былі гатовы да вайны ў любую хвіліну. Плацілі на рубель больш, чым у другіх часцях. Там салдату ў месяц выдавалі тры з паловай рублі. А дэсантнікам — чатыры з паловай. Салдатаў падбіралі дужых — і па фізічных якасцях, і па духу. У казармах тады былі магазіны без прадаўца, дзе адкрыта ляжалі тавары з ваенторга. Узяў, што трэба, узамен паклаў грошы. І ніколі нічога не прападала. Такія салдаты служылі. З парашутам скакалі з непрыстасаванага для такіх мэт цяжкага бамбардзіроўшчыка Ту-4. Сігалі праз бамбалюкі на хуткасці пад 400 кіламетраў у гадзіну. Вылятаеш — аж іскры з вачэй сыплюцца. Трасло нас, як гарох. Часам нават боты на ляту зрывала паветраным патокам.

У 1968 годзе віцебскія «блакітныя берэты» ляталі ў Чэхаславакію ратаваць мясцовую камуністычную ўладу. Другі раз іх ваенныя гарадкі апусцелі, калі СССР увязаўся ў вайну ў Афганістане.

Існуе шмат меркаванняў, чаму менавіта віцябчан паслалі на тую вайну. У Савецкай Арміі было яшчэ шэсць такіх дывізій: у Туле, Пскове, Кіравабадзе, у Адэскай вобласці і яшчэ дзве ў Прыбалтыцы — любую выбірай. Кажуць, што віцебская выглядала найбольш баявой. Спрэчны момант. Праграма падрыхтоўкі дэсанта была агульная, і астатнія злучэнні выглядалі не горш. Па другой версіі — каля Віцебска ў той момант сабралася найбольшая групоўка ваенна-транспартнай авіяцыі, і гэта ўсё вызначыла.

Пра сапраўдныя прычыны, мяркую, даведаемся не хутка. Як і пра тое, ці была

У студзені 1973 года самалёт Ан-12 з віцебскага палка ажыццявіў унікальную аперацыю — дэсантаванне баявой машыны дэсанта (БМД-1) з ваеннаслужачымі ўнутры.

наогул логіка ў «афганскага» лёсу 103-й дывізіі, дарэчы, як і ва ўсёй той кампаніі. Бо калі савецкія стратэгі з розумам планавалі ваенную авантуру, навошта напярэдадні ліквідавалі дэсантную дывізію ў Фергане? Тое злучэнне на ўзбекскай зямлі было «заточана» менавіта на вайну ў горна-пустыннай мясцовасці. Добра, што хоць адзін полк там «разабраць» не паспелі, і 345-ы, ферганскі, трапіў у Афганістан яшчэ раней за віцябчан. «Ферганцы» і прыкрывалі на аэрадромах Кабула і Баграма прыбыццё «беларускай» дывізіі.

У час высадкі і першая бяда напаткала. Ноччу 25 снежня транспартны самалёт Іл-76 капітана Віталя Галаўчына на падлёце сутыкнуўся з гарой. Выжыць нікому не ўдалося, бо на борт, апроч людзей, быў пагружаны яшчэ і бензавоз з палівам. Загінулі 7 членаў экіпажа і 34 дэсантнікі, чацвёра з якіх прызываліся з Беларусі. Каб знайсці іх целы на

цяжкадаступнай вяршыні, з Саюза вызвалі майстроў-альпіністаў.

Адным з першых Герояў Савецкага Саюза на той вайне стаў ваеннаслужачы 103-й дывізіі, старшы сяржант Мікалай Чэпік. Ураджэнец Пухавіцкага раёна атрымаў гэтае званне пасмяротна. Атрымаў за тое, што трапіўшы ў акружэнне, не здаўся, а падарваў і сябе, і душманаў.

Планы адпраўкі віцебскіх дэсантнікаў у Афганістан да апошняга трымалі ў сакрэце. Лічаныя хіба што здагадваліся. Напярэдадні некалькі палкавых і батальённых камандзіраў пад відам турыстаў звазілі ў Кабул, паказалі ім горад. Але не тлумачылі, навошта паказваюць.

Падпалкоўнік Гаравы, начальнік сувязі дывізіі, даведаўся пра баявую задачу за паўтары гадзіны да пачатку. Афіцэры атрымалі карты, а там мясцовасць спрэч карычневага колеру, адны горы. Вось і зразумелі, куды пасылаюць. Пачалі ламаць галаву — як планаваць марш, да якіх арыенціраў прывязвацца, бо дагэтуль вучыліся ваяваць толькі на палях ды ў лясах.

Увесну васьмідзясятага года, калі стараслужачым тэрміновай службы прыйшла пара звальнення, іх з Кабула спачатку прывезлі ў Віцебск. Каб пераапрануць у парадную форму і адправіць дахаты. Прапахшыя порахам салдаты шакіравалі мірны горад сваімі аповедамі пра жахі той вайны (у савецкай прэсе пра афганскую кампанію яшчэ маўчалі ці пісалі, што нашы салдаты дапамагаюць мясцовым жыхарам садзіць кветкі і даюць ім канцэрты самадзейнасці). Дарэчы, і пра абставіны гібелі Мікалая Чэпіка, вельмі засакрэчаныя, яны першымі сказалі праўду. А яшчэ прыехаўшыя з вайны дваццацігадовыя салдаты, як франтавікі, насілі баявыя ўзнагароды. Папрывозілі сапраўдныя амерыканскія джынсы, швейцарскія гадзіннікі, японскія магнітолы — там, у паўфеадальным Афганістане, тавары, пра якія марыла наша моладзь, прадаваліся свабодна і адносна танна. У СССР жа нічога падобнага на прылаўках не было.

Тых, хто адслужыў сваё, у Віцебск больш не прывозілі — іх сталі адпраўляць дахаты з Афганістана.

Не ўсіх жывымі.

На той незразумелай вайне 11 тысяч салдат і афіцэраў дывізіі былі ўзнагароджаны, сямёра атрымалі званні Герояў Савецкага Саюза. 845 чалавек загінулі, 10 — прапалі без вестак. Такая цана іх афганскага шляху.

Пад канец СССР з дывізіяй яшчэ адзін цуд здарыўся: яе перапарадкавалі пагранічным войскам. Дэсантнікі пачалі насіць зялёныя пагоны з зялёнымі берэтамі. Так камічна пад ціскам міжнародных дамоў у СССР спрабавалі ўтаіць сапраўдную колькасць баявых злучэнняў.

Лёс цяперашняга прэзідэнта Інгушэціі Героя Расіі Юнусбек Яўкурава таксама звязаны з Віцебскам. Летам 1989 года той пачынаў лейтэнанцкую службу ў разведроце 350-га паветрана-дэсантнага палка.

Пасля развалу Саюза беларуская армія спрабавала захаваць дывізію. Аказалася дорага. Пачаліся скарачэнні. Перасталі існаваць два палкі ў Баравусе, артылерыйскі полк у Віцебску, асобныя батальёны сувязі, рота разведкі, аўтарота.

З дывізіі спала заслона сакрэтнасці, сюды пачалі наведвацца замежныя калегі. Нават хваленыя «зялёныя берэты» з-за акіяна прыляталі на парашутныя скачкі. Гэта было цікава і надавала гонару. Было ж відаць: выглядаем не горш. Хаця б у баявым сэнсе. Жылі, праўда, куды больш сціпла. Але «дэсантура» не скардзілася. Камандзір дывізіённай разведроты, змучаны адсутнасцю ўласнага жылля, звольніўся, арганізаваў сваю фірму. Як толькі зарабіў на кватэру, то кінуў прыбытковы бізнес і зноў папрасіўся ў дэсант. І ўсё ж яго прынялі назад, у тую ж роту. Прафесіяналамі не раскідваюцца.

Цяпер замест дывізіі — брыгада. Пад тым жа нумарам — 103...

А яшчэ — самалёты...

Вайсковую форму з блакітнымі пятліцамі ў Віцебску насілі не толькі дэсантнікі. У мікрараёне Віцебск-Паўночны з паспяваенных часоў стаяў штаб 3-й гвардзейскай авіятранспартнай дывізіі. І адзін з яе палкоў — 339-ы (два астатнія знаходзіліся на аэрадромах каля Пскова і Ноўгарада).

Служыць у 339-м імкнуліся многія лётчыкі. Зразумела, што Віцебск куды прывабней, чым далёкаўсходні Завіцінск ці пустынны Кіравабад, дзе былі аналагічныя авіяпалкі. Тут і служба была цікавей. Віцебскія транспартнікі абляцелі ці не ўвесь свет. Трапляліся на вайну. Вазілі грузы на тундравыя аэрадромы газавікам ды нафтавікам. Куды, апроч ваенных пілотаў, ніхто даляцець не мог. 339-ы віцебскі і новыя самалёты атрымліваў самым першым. І Ан-12 у свой час, і першыя мадэлі Іл-76 пасля заводскага канвеера менавіта тут аблётвалі.

У студзені 1973 года самалёт з віцебскага палка ажыццявіў унікальную аперацыю — дэсантаванне баявой машыны дэсанта (БМД-1) з ваеннаслужачымі ўнутры. (Дагэтуль экіпажы і машыны скідвалі на парашутах пасобку.) Ахвотных першымі скокнуць у бездань, седзячы ўнутры жалезнай машыны, знайшлося няшмат. І тады тагачасны камандуючы паветрана-дэсантнымі сіламі СССР генерал Маргелаў выбраў свайго сына.

Апошні палёт Іл-76 з віцебскага ваеннага аэрадрома.

Аналагічнае дэсантаванне паспрабавалі ажыццявіць у Францыі, пасадзіўшы ў машыну прыгаворанага да смяротнага пакарання зняволенага. Там скачок закончыўся трагічна, машына з чалавекам разбілася.

Мастацтвазнаўцы сцвярджаюць, што героямі першых прац маленькага Шагала сталі віцебскія вайскоўцы.

жу поспеху, генерал падняўся на назіральную вышку і паклаў побач пісталет. Для сябе, калі здарыцца благое. Праўда гэта ці прыгожы вымысел — невядома. Але ўсё скончылася добра: віцебскія транспартнікі бліскуча выканалі задачу, парашутная сістэма «Кентаўр» таксама не падвяла.

У 339-м палку да 1991 года служыў Віктар Бут, які сёння мае рэпутацыю зброевага барона планетарнага маштабу. У Віцебску ён насіў пагоны звычайнага старшага лейтэнанта. Славіўся як бліскучы паліглот, ведаў шмат моў — англійскую, коха, фарсі, партугальскую. Ці паспеў за тыя віцебскія гады вывучыць беларускую — невядома.

Пасля развалу СССР штаб дывізіі перадыслацыраваўся ў Смаленск — да расійскіх Ваенна-паветраных сіл. А 339-ы полк яшчэ чатыры гады знаходзіўся ў складзе беларускай ваеннай авіяцыі. Пасля яго расфарміравалі, а самалёты перагналі пад Мінск, у Мачулішчы.

Магутныя белакрылыя самалёты прыгожа пакідалі горад — круцілі над яго вуліцамі развітальныя кругі, нібы буслы перад адлётам у вырай. Адстрэльвалі каляровыя феерверкі ракет — цеплавых пастак, як рабілі гэта над краінамі, дзе вялася баявыя дзеянні. Апошні вылет з віцебскага ваеннага аэрадрома датаваны 30 ліпеня 1996 года. Лётчыкі не ўжываюць слова «апошні» — кажуць «крайні». Але вось тут і сапраўды — апошні вылет.

Пра сённяшняе...

Цяпер віцебскі ваенны аэрадром знайсці няпроста. Мы шмат паблукалі па гарадскіх ваколіцах, пакуль натыкнуліся на паросшую травой і хмызняком былую ўзлётную паласу. Тая бетонка па сваіх характарыстыках магла прымаць нават «Боінгі» і «Аэрбасы». Але не прыняла. Жыццё прымусіла стварыць на тэрыторыі ваеннага аэрадрома прадпрыемствы свабоднай эканамічнай зоны.

— Здаралася, без сувязі ляталі праз увесь свет, над акіянамі трымалі рэжым радыёмаўчання, што ніякаму грамадзянскаму пілоту не пад сілу, — успамінае ветэран палка Іван Навічкоў. — У раёнах баявых дзеянняў ішлі на пасадку, амаль у піке звальваючыся. Каб менш было шанцаў падбіць самалёт. І гэтак жа, на звышперагрузках да цемры ў вачах, узляталі. А Іл-76 не знішчальнік ці спартыўны самалёт, а цяжкі транспартнік вагой пад дзвесце тон. Пакуль узляціш ці сядзеш — кашуля наскрозь ад поту мокрая.

Полк перастаў існаваць, але некаторыя яго лётчыкі працягваюць сваю справу.

Некалькі гадоў таму Віцебск запоўніўся вайскоўцамі-маракамі. Тут прайшла маштабная сустрэча ветэранаў-падводнікаў Беларусі і Расіі. Былыя камандзіры, штурманы і матросы экіпажаў атамных і дызельных субмарын для святкавання Дня падводніка ўпадабалі горад над Дзвіной. Віцебск яны выбралі невыпадкова. Горад заўсёды слаў падводнаму флоту добрае папаўненне. За подзвігі пад вадой два яго ўраджэнцы атрымалі зоркі Герояў. Сённяшні камандуючы Чарнаморскім флотам Расіі таксама ў Віцебску нарадзіўся.

У Віцебску жыве Іван Фёдаравіч Алейнік. На вайне ён быў з самага першага дня. Служыў у дальняй бамбардзіровачнай авіяцыі. Яго полк і Маскву абараняў, і яшчэ з сорак першага лятаў бамбіць далёкія тылы праціўніка — аж да Аўстрыі і Румыніі даляталі. Пасля вайны афіцэра перавялі на Віцебшчыну. Дзе давялося стаць звышсакрэтным спецыялістам: іх часць першай атрымала для ўзбраення самалётаў атамныя бомбы.

— Страшна было спачатку нават глядзець на іх, ведаючы, што за жудасная моц туды закладзена. Ды і працаваць было няпроста, — успамінае ветэран «атамнай» часці. — Не буду раскрываць тэхналогію нашай службы. Гэтага і сёння рабіць не трэба. Скажу толькі пра ўзрывальнікі. У першых мадэлях бомбаў яны былі вадкаснымі, вельмі небяспечнымі самі па сабе. Хто ў нас іх тады абслугоўваў, вельмі рана пайшлі з жыцця. Нас было дзесяць у камандзе, а хутка засталося ўсяго двое. Праўда, мы яшчэ і сёння ўжывых.

Віцебскі ветэран не губляе бадзёрасці, актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці і піша вершы. Многія яго паэтычныя радкі — менавіта пра горад, які стаў яму родным.

Вікенцій КЛЮЧНІК

■

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ

Круглянский районный исполнительный комитет проводит аукционы

Лот №	Место расположения/ кадастровый номер земельного участка	Площадь земельного участка, га	Начальная цена, бел. рублей	Сумма задатка, бел. рублей	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений	Примечание
Аукцион на право заключения договора аренды земельного участка для строительства и обслуживания торгового павильона некапитального типа, код – 1 16 03 – земельный участок для размещения объектов розничной торговли в г.п. Круглое						
1.	ул. Советская, (район автостанции) 724255100001001399	0,0042	479 250	47 925	участок свободен от застройки, инженерные коммуникации отсутствуют	срок аренды 10 лет
Аукцион на право заключения договора аренды земельных участков для установки помещений для хранения плавательных средств, код – 1 12 00 – земельный участок для размещения объектов транспорта в границах дер. Шупени Круглянского сельсовета Могилевской области						
2.	дер. Шупени, 724280619601000136	0,0997	26 900	2 690	участок свободен от застройки, инженерные коммуникации отсутствуют	срок аренды 10 лет
3.	дер. Шупени 724280619601000137	0,1915	51 600	5 160	участок свободен от застройки, инженерные коммуникации отсутствуют	срок аренды 10 лет
Дата и время проведения аукциона	«7» октября 2013 года, 15.00					
Последний день подачи заявления	«1» октября 2013 года до 17.00					

Земельные участки находятся в водоохранной зоне реки Друть и прибрежной полосе Тетеринского водохранилища.

Аукцион состоится по адресу: Могилевская область, г.п. Круглое, ул. Советская, 34, каб. 52 (зал заседаний).

Продавец: Круглянский районный исполнительный комитет, Могилевская область, г.п. Круглое, ул. Советская, 34.

Имеются решения об отводе земельных участков.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

В аукционе по продаже права заключения договоров аренды земельных участков допускаются **граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели**:

- подавшие в комиссию не позднее чем за три дня до проведения аукциона заявление на участие в аукционе;

- внесшие задаток (заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка);

- представившие: гражданином – копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность; ИП и юридическим лицом – копию свидетельства о государственной регистрации, копию Устава.

Задаток в размере 10% от начальной цены, заявленного лота, перечисляются на расчетный счет № 3641004260177 в ЦБУ № 715 г.п. Круглое филиала № 726 АСБ «Беларусбанк» г. Шклов, код 153801555, УНП 700218302, код платежа 040002, получатель – Круглянский районный исполнительный комитет.

Оплата осуществляется денежными средствами по наличному и безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка Республики Беларусь. Условия оплаты: разовый платеж.

Условия, предусмотренные в решении об изъятии и предоставлении участков для проведения аукциона: своевременное внесение победителем аукциона платы за соответствующие земельные участки; возмещение им расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона и формированием этих земельных участков, учитывая их государственную регистрацию.

Заявления принимаются ежедневно, кроме воскресенья, с 8.00 до 17.00 по адресу: г.п. Круглое, ул. Советская, 51 (здание АСБ «Беларусбанк»), 2-й этаж, каб. 221.

Предварительное ознакомление покупателей с земельным участком в натуре (на местности) – в день подачи заявления.

Контактные телефоны: 51 974, 51 180.

ОАО «НАФТАН»

РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ (с повышением начальной цены) БЫВШЕЕ В УПОТРЕБЛЕНИИ НЕИСПОЛЬЗУЕМОЕ ИМУЩЕСТВО:

Пометка на конверте	Наименование	Инв. №	Год выпуска	Начальная цена с НДС, руб. РБ
1. Реализация неликвидов. Легковой транспорт.	Автомобиль ВАЗ 21102	13150687	2004	28 800 000
	Автомобиль ВАЗ 21200	13150657	2003	30 720 000
	Автомобиль ВАЗ 21104	13150712	2005	30 720 000
	Автомобиль ВАЗ 21093	13150600	2002	17 280 000
	Автомобиль УАЗ 2206	13151025	2004	28 800 000
2. Реализация неликвидов. Прицепы.	Прицеп САТ-123-01	13150926	2011	140 400 000
	Прицепная емкость ПСЕ-Ф12.5	06262116	2004	20 160 000
	Полуприцеп МАЗ 9758 012	13151032	2004	72 000 000
3. Реализация неликвидов. Спецтехника.	Автобус МАЗ 103 002	13150663	2003	102 000 000
	А/маш Ивеко 330-36НТ	13150230	1992	211 200 000
	Экскаватор-планировщик на шасси МАЗ 6317 05	04150930	2006	618 000 000
4. Реализация неликвидов. МАЗ.	Автомашина МАЗ-54323	13150446	1995	25 600 000
5. Реализация неликвидов. Сенокосилка.	Сенокосилка ФМ-1,3	194877	2002	518 400

Состояние удовлетворительное.

Предложения принимаются по адресу: **211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101 до 19 сентября 2013 года** с соответствующими пометками на конверте, указанными в таблице.

Извещение на проведение конкурса размещено на сайте **www.naftan.by.**

Контактные телефоны: **8(0214) 55 78 85, 8(0214) 55 78 66, 8(0214) 55 79 07, 8(044) 553 02 59.**

УНП 300042199

Уважаемые акционеры!

Открытое акционерное общество «Завод гидравлического машиностроения» г. Кобрин ИЗВЕЩАЕТ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ 23 августа 2013 года в 14.00 ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ в смешанной форме по адресу: г. Кобрин, ул. Советская, 109, зал заседаний.

Повестка дня внеочередного общего собрания:

1. Об утверждении показателя по экономии ресурсов.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 13.00 до 13.45 в день и по месту проведения собрания на основании: акционер — паспорт; представитель — паспорт и доверенность, оформленная в соответствии с действующим законодательством. Заполненные бюллетени представить Обществу не позднее 20 августа 2013 года по месту проведения собрания.

Список акционеров Общества, имеющих право на участие в собрании, составлен на основании реестра акционеров по состоянию на 15 августа 2013 г.

УНП 200093330

Открытое акционерное общество «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43, **извещает акционеров о том, что 27 августа 2013 г. в 15.00 в актовом зале предприятия состоится внеочередное общее собрание акционеров.**

УНП 100258980

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

«О начислении и выплате дивидендов за первое полугодие 2013 года».

С проектами решения собрания акционеры могут ознакомиться в рабочие дни, начиная с 19 августа 2013 года по месту нахождения Общества (инвестиционный отдел, 3-й этаж).

Регистрация участников собрания будет проводиться в актовом зале предприятия **с 14.15 до 14.45**.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — нотариально заверенную доверенность).

Директор *Песецкий В.Н.*

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

«Строительство многоэтажного жилого дома со встроенными помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой № 10 по генплану в микрорайоне «Каменная Горка-2»

Общество с ограниченной ответственностью «Футбольный клуб «Сквич» информирует физических и юридических лиц о создании объекта долевого строительства.

Информация о Застройщике.

ЗАСТРОЙЩИК (Заказчик) – ООО «Футбольный клуб «Сквич».

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 26 ноября 2004 года № 2391 в Едином государственном регистре юридических и индивидуальных предпринимателей за № 190583075.

В течение предыдущих лет организацией осуществлялось строительство 3-х многоэтажных жилых домов серии М 111- 90 в границах улиц Одоевского, Бельского, Пономаренко во Фрунзенском районе города Минска, генподрядчиком которых являлась строительная организация ОАО «МАПИД».

Информация о проекте.

Цель строительства – ввод в эксплуатацию жилого дома со встроенными помещениями и подземной гараж-стоянкой № 10 по г/п в микрорайоне «Каменная Горка-2».

Объект долевого строительства – многоквартирный жилой дом **№ 10** по генплану, монолитно-каркасный со стенами из газосиликатных блоков, **состоит из пяти 12-16-18-этажных секций**, со встроенными помещениями общественного и административного назначения на первом этаже и встроенно-пристроенным гаражом-стоянкой на 144 машино-мест (304-квартирный жилой дом), с техническим подпольем и теплым техническим чердаком, высота жилых этажей – 2,6 метра. Категория комфортности по шуму – «В». **Потолки:** монолитно-железобетонные плиты. **Стены** – блоки из ячеистого бетона; **перегородки** – кирпичные (из полнотелого и пустотелого керамического кирпича). **Полы** – железобетонная плита (стяжка). Вентиляция жилых помещений – естественная. Отопление, электричество, водоснабжение, канализация – городские сети с индивидуальными приборами учета.

Секция оснащена 2 лифтами грузоподъемностью 400 кг и 630 кг и мусоропроводом.

Наружная отделка: стены – окраска фасадными красками; утепление, металлические элементы окрашиваются эмалями. **Общая площадь квартир – 19999,76 кв. метров. Всего – 304 (триста четыре) квартиры.**

Участок для строительства жилого дома расположен во Фрунзенском районе в городе Минске, система подъездов к проектируемой застройке организована с улиц Проектируемая № 2 – Проектируемая – № 4 на застраиваемой территории.

Благоустройство территории: включает подъезд к дому, озеленение, пешеходные дорожки, аллеи, устройство детской и взрослой площадки для отдыха, организацию проездов и гостевых автостоянок, а также площадки для хозяйственных нужд с установкой на них оборудования и малых архитектурных форм.

Для привлечения физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей предлагаются к строительству по договорам создания объекта долевого строительства **30 (тридцать) квартир, из них:**

- однокомнатные – минимальной общей площадью от 47,16 кв.м – 10 (десять) квартир; максимальной стоимостью 1500 долларов США;

- двухкомнатные – минимальной общей площадью от 62,34 кв.м – 10 (десять) квартир; максимальной стоимостью 1500 долларов США;

- трехкомнатные – минимальной общей площадью от 85,76 кв.м – 10 (десять) квартир; максимальной стоимостью 1500 долларов США;

- **машино-места**, связанные с Объектом долевого строительства – стоимостью 19 999 долларов США при 100% оплате, стоимостью 24 000 долларов США с рассрочкой до 24 месяцев.

Оплата производится в эквиваленте в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату платежа.

Отделка квартир не выполняется.

Все квартиры – имеют летние помещения (лоджии), окна – из профиля ПВХ.

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические помещения и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков.

Характеристика встроенных помещений.

В жилом доме в секциях 1 и 2 располагаются нежилые помещения общественного назначения. Звукоизоляция между помещениями организована согласно норм.

Строительство производится при наличии следующих документов:

- акт выбора места размещения земельного участка, утвержденного 04 марта 2009 года Председателем Минского городского исполнительного комитета;

- свидетельство (удостоверение) № 500/727-5423 о государственной регистрации;

- решение на строительство Минского городского исполнительного комитета № 659 от 17.03.2011 г.;

- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу, заключение РУП «ГОССТРОЙЭКСПЕРТИЗА по городу Минску» № 1667-15/10 от 03.01.2011 г.;

- договор строительного подряда – ИП «ГЕРБЕЛИНТОРГТРАНС» № СП-42/07/12 от 05.07.2012 года;

- выданное органом государственного строительного надзора разрешение на производство строительно-монтажных работ от **30.11.2012 г. (№ 2-208 Ж- 029/11)**.

Начало строительства – 2 квартал 2011 года.

Нормативная продолжительность строительства жилого дома по г/п № 10 – 29,2 месяца. Предложение, указанное в настоящей Проектной декларации долевого строительства, действует до момента опубликования новой проектной декларации.

Подробные сведения об объекте долевого строительства и условиях заключения договоров на строительство можно получить по адресу: 220082, г. Минск, ул. Притыцкого, 34, подъезд 4, офис 1, тел. для справок: 8 029 605 09 09, 216 91 44, 216 91 45. Режим работы: понедельник–пятница с 08.30 до 17.30, обед: с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.



Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, г. Дзяржынск.

СТАРАЖЫТНАЯ БЕЛАРУСЬ — КАЛЫСКА ПІСЬМЕННАСЦІ І КНІГАДРУКАВАННЯ ВА УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

Па гарызанталі: 2. Скандынаўскія сказанні, у якіх распавядаецца аб Полацку і іншых старажытных гарадах Беларусі. 4. У старажытных грэкаў і рымлян лічыльная дошка, якая выкарыстоўвалася ў Заходняй Еўропе аж да XVIII стагоддзя. 9. Тураўскае ... . Адзін з найстаражытнейшых помнікаў славянскай пісьменнасці, напісаны кірыліцай; захоўваецца ў Літве. 10. Стук ад удараў ног пры бегу, хадзьбе. 12. Навучальная ўстанова; першая на Беларусі ... была адкрыта асветніцай, святой Ефрасінняй Полацкай у манастыры, дзе яна навучала грамаце манашак. 14. Чырвоны радок, водступ управа ў пачатку першага радка тэксту; упершыню ... у сваіх творах увёў беларускі асветнік, першадрукар Ф. Скарына. 16. Знак для абазначэння ліку. 18. Якуб ... . Віленскі мецэнат, пры падтрымцы якога Ф. Скарына стварыў у Празе першае ў гісторыі беларускае выдавецтва; вярнуўшыся на радзіму, Ф. Скарына абсталяваў у Вільні, у доме Якуба..., першую ва Усходняй Еўропе друкарню. 19. «... — люстэрка людскога жыцця і душэўныя лекі, уцеха — самотным, зняверaным — помач, асабліва тым, каго немач точыць». Цытата Ф. Скарыны. 21. Пётр ... . Літаратар, друкар; у Вільні дзейнічала яго друкарня, якую ён перавёз у мястэчка Любча, што на Навагрудчыне. 26. «Дык шануй, беларус, сваю мову -\\Гэта ... нам на вечныя годы».(«Ты, мой брат, каго завуць беларусам...» А.Гарун). 27. Старадрукаваныя кнігі. 28. Марк ... .Амерыканскі пісьменнік, які першым у свеце прынёс у выдавецтва кнігу ў машынапісным выглядзе. 29. Харавая песня-гімн, пашыраная на Беларусі ў XV—XVIII ст.

Па вертыкалі: 1. Іншасказальнае апавяданне з павучальным вывадам; літаратурны жанр, які выкарыстоўваў у сваіх працах старабеларускі пісьменнік, багаслоў Кірыла Тураўскі. 2. «Любіце і шануйце, як святыню, роднае слова, з якім вас літасцівы Бог на ... пусціў». Запавет Ф. Скарыны. 3. Вялікі і высокі будынак. 5. Свінцовая пячатка, якую некалі прывязвалі на раменчыку да пісьмовага дакумента. 6. Расшыраны ўнізе крой штаноў. 7. Старажытнае «вечнае пяро» ў выглядзе жалезнага або бронзавага стрыжаня. 8. ...! Вокліч з пераможнай інтанацыяй. 11. Папулярны ў XVI—XVII ст. жанр беларускай літаратуры, пачынальнікам якога быў Ф. Скарына. 13. Князь — ... . Так называлі ў народзе сына княгіні Рагнеды Ізяслава, вялікага аматара кніг; пячатка з яго іменем — самы даўні помнік пісьменства на Беларусі. 15. Насценнае асвятляльнае прыстасаванне. 17. «На Беларусі ... жыве». Верш Ул. Караткевіча. 18. Кніжка для першапачатковага навучання грамаце; тэрмін «...» упершыню ўжыў беларускі друкар і асветнік Спірыдон Собаль. 20. Першы друкаваны рускі падручнік, што ўбачыў свет у 1574 годзе дзякуючы кнігавыдаўцу-асветніку Івану Фёдараву, які паходзіць з беларускага роду Рагозаў. 22. ... ды лебяда — для палеткаў бяда (прык.). 23. Невялікі рэстаран. 24. «Перачытаў радкі кірыліцы прыгожай\\І воску з ладанам прыемны ... пачуў». («Кніга». М. Багдановіч). 25. Чырвона-буры налёт на жалезе; у старажытнасці састаўная частка чарніла. 26. Невялікі манастыр у глухой мясцовасці.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:

Па гарызанталі: 2. Сагі. 4. Абак. 9. Евангелле. 10. Тупат. 12. Школа. 14. Абзац. 16. Лічба. 18. Бабіч. 19. Кніга. 21. Кміта. 26. Скарб. 27. Старадрук. 28. Твэн. 29. Кант. **Па вертыкалі:** 1. Прытча. 2. Свет. 3. Гмах 5. Була. 6. Клёш. 7. Пісала. 8. Ага! 11. Акафіст. 13. Кніжнік. 15. Бра. 17. Бог. 18. «Буквар». 20. «Азбука». 22. Асот. 23. Кафэ. 24. Пах. 25. Іржа. 26. Скіт.

УСМІХНЕМСЯ

У жанчыне павінна быць маленькая загадка, а не рэбус або суперкрыжаванка.

Дзеці — кветкі жыцця :)
— Мама, а гэты гіганцкі кусок торта ты пакінула Машы?
— Не, табе.
— Такі маленькі кавалачак?

Калі будаўнік, якога вы запрасілі замест папярэдняга, не пачаў з таго, што аблаяў працу папярэдніка, ганіце яго ў шыю! Гэта не сапраўдны будаўнік!

Жонка — мужу:
— Калі цябе сашлюць у Сібір, я, вядома, паеду разам з табою. Але футра трэба купіць загадзя.

Кава на працы — гэта напой, які п'юць, калі хочуць есці.

Урач агледзеў пацыента і забараніў яму піць.
— Доктар, я вінароб і раблю класнае віно. Мне і яго нельга?
— Са мной — можна!

caricatura.ru

СЁННЯ

Сонца	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.46	20.41	14.55
Віцебск —	5.31	20.35	15.04
Магілёў —	5.36	20.31	14.55
Гомель —	5.38	20.23	14.45
Гродна —	6.02	20.56	14.54
Брэст —	6.07	20.51	14.44

Месяц

Першая квадра ў 13.57. Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

***Пр.** ПЕРШЫ СПАС (Макавей), Аляксандра, Дзмітрыя, Гурыя.*
***К.** Сільвіі, Максіміляна, Яўсея, Альфрэда.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты | Падзеі | Людзі

1385 год — у Крэўскім замку (цяпер Смаргонскі раён) заключана Крэўская унія, дзяржаўны саюз паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай. Крэўская унія — зацвярджэнне вялікім князем літоўскім Ягайлам папярэдне прынятых абавязацельстваў перайсці ў каталіцтва і ахрысціць паводле лацінскага абраду ўсіх язычнікаў-літоўцаў, а таксама стварыць дзяржаўны саюз (унію) ВКЛ і Кароны Польскай. Крэўскую унію падпісалі Ягайла, князі трокскі Скіргайла, мсціслаўскі Лугвен, ноўгарад-северскі Карыбут, трокскі і гродзенскі Вітаўт. Агульным фактарам саюза з'яўлялася барацьба абедзвюх дзяржаў з Тэўтонскім ордэнам. У стварэнні саюза былі зацікаўлены літоўскія і беларускія феадалы, польская знаць, якая жадала спыніць ваенныя канфлікты з ВКЛ з-за Валыні, а таксама каталіцкая царква (яна атрымлівала магчымасць ахрысціць апошні паганскі народ у Еўропе). Абедзве дзяржавы аб'ядноўваў адзін манарх, але кожная з іх мела сваю сістэму кіравання, праводзіла самастойную палітыку. 2 лютага 1386 года на з'ездзе польскай шляхты ў Любліне Ягайла будзе абраны каралём Польшчы, яшчэ праз месяц — каранаваны. Адбывалася паступовае збліжэнне дзяржаўных інстытутаў ВКЛ і Польшчы, а таксама культурнае збліжэнне вярхоў грамадства. Дзякуючы саюзу ўдалося ліквідаваць пагрозу з боку Тэўтонскага ордэна, перамагчы яго ў Грунвальдскай бітве 1410 г., адкрыць гандлёвыя шляхі ў Заходнюю Еўропу. На ўсходзе ВКЛ з дапамогай Польшчы стрымлівала націск Маскоўскай дзяржавы. Вынікамі уніі былі шырокі дыпламатычны выхад ВКЛ у Еўропу, а таксама культурнае збліжэнне з іншымі краінамі Еўропы.

1941 год — у Атлантычным акіяне на борце англійскага лінкора «Прынц Уэльскі» прэзідэнт ЗША Ф. Рузвельт і прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі У. Чэрчыль падпісалі Атлантычную хартыю, якою абвясцілі асноўныя прынцыпы вядзення вайны супраць фашызму і пасляваеннага ўладкавання свету. 24 верасня да яе далучыўся і СССР.

1947 год — нарадзіўся (вёска Караліна Мінскага раёна) Уладзімір Пятровіч Крук, беларускі гісторык, кандыдат гістарычных навук (1985). Аўтар навуковых прац па гісторыі сялянства і сельскай гаспадаркі Беларусі перыяду капіталізму.

Было сказана

Максім БАГДАНОВІЧ, паэт, перакладчык:

«Сэнс існавання кожнай інтэлігенцыі: яна развівае народную культуру».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 22.974. Індэкс 63850. Зак. № 3532.

Нумар падпісаны ў 19.30 13 жніўня 2013 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12